ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і МАСТАЦТВА

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

№ 93 (1730) | Аўторак, 20 лістапада 1962 года | Цана 4 кап.

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ АБ ПЛЕНУМЕ ЦЭНТРАЛЬНАГА КАМІТЭТА КАМУНІСТЫЧНАЙ ПАРТЫІ САВЕЦКАГА САЮЗА

19 лістапада 1962 года ў Вялікім Крамлёўскім палацы адкрыўся Пленум Цэнтральнага Камітэта КПСС.

На парадку дня Пленума пытанне аб развіцці эканомікі СССР і партыйным кіраўніцтве народнай гаспадаркай.

З дакладам па гэтаму пытанню выступіў Першы Сакратар ЦК КПСС, Старшыня Савета Міністраў СССР таварыш М. С. Хрушчоў.

Для ўдзелу ў рабоце Пленума ЦК запрошаны першыя сакратары абкомаў партыі, якія не ўваходзяць у састаў Цэнтральнага Камітэта, сакратары некаторых абкомаў і крайкомаў КПСС, што займаюцца прамысловасцю і сельскай гаспадаркай, першыя сакратары і сакратары гаркомаў партыі буйных прамысловых цэнтраў, старшыні Саветаў Міністраў саюзных і аўтаномных рэспублік, старшыні выканкомаў абласных і краявых Саветаў дэпутатаў працоўных, старшыні Дзяржпланаў і Саўнаргасаў саюзных рэспублік, міністры саюзных рэспублік па вытворчасці і нарыхтоўках сельскагаспадарчых прадуктаў, міністры сельскай гаспадаркі, воднай гаспадаркі і будаўніцтва, старшыні аб'яднанняў «Сельгастэхніка» саюзных рэспублік, дырэктары некаторых прадпрыемстваў, перадавікі вытворчасці прамысловасці і сельскай гаспадаркі, работнікі міністэрстваў, Дзяржаўных Камітэтаў СССР і РСФСР, рэдактары цэнтральных газет і часопісаў, адказныя работнікі апарату ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР.

Пленум ЦК КПСС працягвае работу.

Нашы інтэрв'ю

ХІРУРГІ ЗЯМЛІ

Ішоў дождж. Нават у «Пабедзе», што везла нас на доследнае поле, было вільготна і няўтульна. Анатоль Цімафеевіч Вагін, супрацоўнік Цэнтральнага навукова-даследчага інстытута механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі нечарназёмнай зоны СССР моўчкі вёў машыну, асцярожна аб'язджаючы незлічоныя лужыны, быццам не хацеў расплёскваць іх.

Не ведаю чаму, мне прыгадаліся вясёлыя дзіцячыя вершы:

Працягні свае далоні,
Хай праз пальцы дождж льецца!
У небе хмары быццам коні,
А ў тваіх далонях — лейцы...

Толькі калі я пачула ціхі смех, я зразумела, што прачытала гэты верш уголас. Твар Анатоля Цімафеевіча, які да гэтага быў такі засяроджаны, неяк адразу змяніўся. Вочы заіскрыліся вясёлымі смяшынкамі.

Машына нечакана затармазіла і яе гаспадар адчыніў дзверцы.

— Ой, як гэта добра сказана — утайміваць дождж, узяць у рукі лейцы і кіраваць стыхіяй! Хадземце на поле і вы зразумееце, як гэта неабходна і як гэта магчыма.

Не чакаючы, пакуль я зашпілю плашч, Анатоль Цімафеевіч энергічна пакрочыў да іржышча, што відаць было за дарогаю.

— Глядзіце, вось тут і на сотнях гектараў навокал, нягледзячы на вялікія дажджы, глеба амаль не насычана вільгаццю

Вагін нахіліўся, узяў у руку невялічкі жаўтлявы камячок зямлі і, расціраючы яго пальцамі, працягваў.

— Уся бяда ў тым, што і ўвосень і ўвесну гэтыя так званыя лёгкія глебы паводзяць сябе аднолькава. Толькі ў нашай рэспубліцы іх каля чатырох мільёнаў гектараў, або 65 працэнтаў ворнай зямлі. Яны, як вядома, малаўрадлівыя. Ворны гарызонт неглыбокі, атрымаць добры ўраджай нельга без унясення вялікай колькасці ўгнаенняў. Ну, а цяпер, калі вы самі бачыце, як прамываюцца гэтыя глебы дажджамі, можаце лёгка ўявіць, якую вялікую эканамічную шкоду сельскай гаспадарцы наносіць гэтая, на першы погляд, няшкодная здольнасць — не затрымліваць вільгаць.

Нібы раззлаваўшыся, Анатоль Цімафеевіч кінуў зямлю і падставіў далонь пад дождж.

— Вось таксама вада нясе ў глыбокія пласты спажыўныя рэчывы, што ўносяцца з угнаеннямі, вось таксама знікае вільгаць з накатнага пласта вясною, калі яна так патрэбна раслінам. Аднак глебы гэтыя маюць і станоўчыя якасці. Яны лёгка апрацоўваюцца, вясною хутка прасыхаюць. Апроч таго, у такой глебе мікраарганізмы маюць высокую актыўнасць. Калі павялічыць ёмкасць вільгаці зямлі, зменшыць водапранікальнасць, можна атрымліваць выдатныя ўраджаі ўсіх культур, асабліва бульбы.

Анатоль Цімафеевіч змоўк, нібы даючы магчымасць субяседніку засяродзіцца і зразумець усю важнасць таго, пра што ён толькі што гаварыў.

— Так, але ж гэта праблемы агратэхнікі і глебазнаўства? — запыталася я.

— Аграномы і глебазнаўцы зрабілі сваю справу, — працягваў мой субяседнік. — Яшчэ перад вайною беларускія вучоныя Шпілеўскі і Лупіновіч праводзілі доследы па акультываванню пясчаных дзярнова-падзолістых глеб. Сам па сабе метад даволі цікавы. Арганічныя ўгнаенні ўносіліся на розную глыбіню. Вынікі аказаліся вельмі добрымі. Пры ўнясенні ўгнаенняў на 30 — 40 сантыметраў рэзка мяняўся водны рэжым глеб, палепшыліся ўмовы для развіцця сельскагаспадарчых культур. А чаму? Загадка раскрываецца проста. Арганічнае рэчыва на такой глыбіні мінералізуецца больш павольна. — Анатоль Цімафеевіч спыніўся на момант, уважліва паглядзеў на мяне і рантам запытаўся. — Можа, мой расказ вельмі сухі і нецікавы?

Я запратэставала. Тады Анатоль Цімафеевіч працягваў:

— Яшчэ лепшыя вынікі атрыманы прафесарам Венгерскага інстытута глебазнаўства і агратэхнікі Шандарам Эгерсегі. Дарэчы, тры гады назад у нас, у Мінску, праходзіла міжнародная канферэнцыя па павышэнню ўрадлівасці лёгкіх глеб і я з вялікай цікавасцю слухаў паведамленне венгерскага вучонага. Ён даказаў, што арганічнае рэчыва трэба ўносіць у глебу пластамі. Першы пласт — на глыбіню 45—60 сантыметраў, прыкладна праз тры гады — другі, на 15 сантыметраў вышэй за першы. Унесеныя такім чынам угнаенні, захаваюць сваё дзеянне на працягу 10 год. Вось мерапрыемства, якое карэнным чынам мяняе водна-паветраны рэжым глебы, а гэта значыць і яе ўрадлівасць. Угнаенні затрымліваюць вільгаць і спажыўныя рэчывы, з'яўляюцца своеасаблівым падмуркам ворнага пласта. Вось вам і тыя самыя лейцы, пра якія мы гаварылі.

Як бачыце, аграномы і глебазнаўцы не толькі вырашылі праблему, але і паставілі перад намі, механізатарамі, задачу — стварыць машыны для яе практычнага ажыццяўлення.

Яшчэ не бачачы новай машыны, якую стварылі вучоныя-механізатары для пластавага ўнясення ўгнаенняў, я падумала: якія складаныя пошукі. І людзі ідуць па правільным шляху. Машына такая патрэбна, яна будзе жыць.

А пошукі былі і сапраўды не простыя. Калі мы ехалі на доследную станцыю, Анатоль Цімафеевіч расказаў пра спробы механізаваць пластовае ўнясенне ўгнаенняў не толькі ў нас, але і за рубяжом. У Венгрыі, дзе гэты метад даўно ўкараняецца, выкарыстоўваюць плантажны плуг. Пасля праходу плуга ўгнаенні кладуць на дно баразны роўным пластам. Потым, пры другім праходзе, іх засыпаюць. Але плантажны

(Заканчэнне на 4-й стар.).

ЧАСОПІСЫ у лістападзе

«ПОЛЫМЯ»

Як і ў папярэдніх нумарах, часопіс друкуе матэрыялы, прысвечаныя 80-годдзю з дня нараджэння народнага паэта БССР Якуба Коласа. У адзінаццатай кніжцы змешчаны вершы Міколы Хведаровіча і Алексы Юшчанкі, прысвечаныя юбіляру, а таксама працяг белетрызаваных успамінаў Максіма Лужаніна «Колас расказвае пра сябе».

Часопіс друкуе заканчэнне трэцяй кнігі Піліпа Пестрака «Серадзібор», вершы Андрэя Александровіча, Антона Вялевіча, Кастуся Кірэйчыка, Мацея Грубіяна. У перакладзе з чашскай мовы змешчана апавяданне Іржы Марэка «Выхаваўца».

Чытач знойдзе ў нумары працяг «Белазёрскага дзённіка» Ул. Дадзімава, нататкі А. Карпюка «На пероне Гродзенскага вакзала» — пра сустрэчы з замежнымі турыстамі. Праблеме выкарыстання алюмінію прысвечаны артыкул А. Тафа «Крылаты метал».

З'явіўся ў часопісе і новы раздзел — «Пісьменнікі пра сябе». Тут надрукавана аўтабіяграфія Івана Мележа. З успамінамі пра славацкіх воінаў — сяброў па зброі ў мінулай вайне — выступае І. Вятроў.

У раздзеле «Бібліяграфія» з рэцэнзіямі на новыя кнігі выступаюць Р. Шкраба, Я. Герцовіч, Я. Усікаў. Надрукаваны тут таксама некалькі кароткіх рэцэнзій.

Гумар прадстаўлены ў часопісе апавяданнем Івана Грамовіча «Два ў два—дзевяць».

ЗА ПЛЁННУЮ ПРАЦУ

Імя Паўла Кавалёва добра вядома беларускаму чытачу. У сувязі з пяцідзесяцігоддзем з дня нараджэння і за шматгадовую работу ў друку Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў пісьменніка, галоўнага рэдактара часопіса «Вожык» Паўла Кавалёва Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

* * *

За заслугі ў развіцці беларускай літаратуры і ў сувязі з шасцідзесяцігоддзем з дня нараджэння паэт Машара Міхаіл Антонавіч узнагароджан Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

У ГЭТЫМ НУМАРЫ

З'ЕЗД РАБОТНІКАЎ КІНЕМАТАГРАФІІ ЗАКОНЧЫЎ СВАЮ РАБОТУ
ДНІ ЧЭХАСЛАВАЦКАЙ КУЛЬТУРЫ Ў БЕЛАРУСІ
ПРАЦЯГВАЕМ РАЗМОВУ АБ ВЫКЛАДАННІ ЛІТАРАТУРЫ

З КЛОПАТАМ ПРА ЗАЎТРАШНІ ДЗЕНЬ МАСТАЦТВА

ПЕРШЫ З'ЕЗД БЕЛАРУСКІХ КІНЕМАТАГРАФІСТАЎ

Даклад аргкамітэта Саюза кінематаграфістаў БССР Першаму, Устаноўчаму з'езду, скарочаная стэнограма якога змешчана ў мінулым нумары нашай газеты, па сутнасці абмінаў шматлікія канкрэтныя пытанні дзейнасці аргкамітэта, які існуе з сакавіка 1958 года.

Сярод дэлегатаў была распаўсюджана спецыяльная справаздача, дзе падрабязна прааналізавана работа арганізацыйнага камітэта саюза і ўзняты праблемы, якія, на думку бюро, неабходна было вынесці на абмеркаванне з'езда.

Справаздача паведамляе аб стварэнні і рабоце секцый: мастацкай кінематаграфіі, дакументальнага кіно (яна ж вядзе і работу з кінаматарамі), навукі і тэхнікі, драматургіі і кінакрытыкі і пастаяннай ваеннай камісіі.

За гады існавання аргкамітэт прыняў у члены Саюза кінематаграфістаў 71 чалавека.

Паколькі аргкамітэт не меў свайго прэзідыума, усе найбольш важныя пытанні вырашаліся на агульных сходах членаў саюза з удзелам актыву секцый, у якім налічваецца 79 чалавек. На іх абмяркоўваліся вынікі III-га пленума аргкамітэта Саюза работнікаў кінематаграфіі СССР і задачы павышэння ідэйна-мастацкай якасці кінафільмаў на сучасную тэму, праблемы майстэрства ў беларускіх фільмах, іх музычнага афармлення і выяўленчага вырашэння. На адным з апошніх сходаў кінематаграфісты рэспублікі абмяркоўвалі свае задачы ў святле рашэнняў XXII з'езда КПСС.

Аргкамітэт на сваіх пасяджэннях (іх было звыш сарака) разглядаў тэматычныя планы вытворчасці мастацкіх, хранікальна-дакументальных і навукова-папулярных фільмаў, абмяркоўваў даклады аб рабоце сваіх секцый, наладжваў кінафестывалі. У справаздачы паведамляецца і аб дзейнасці гэтых пасяджэнняў. Так, пасля абмеркавання праблем кінакрытыкі і тэорыі кіно ў ліпені 1959 г. было «вырашана ўстанавіць больш цесныя сувязі з Інстытутам мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР, намечаны сумесныя з ім выданні асобных работ па гісторыі беларускага кіно і рэкамендацыі тэм для кандыдацкіх дысертацый». Акрамя таго, аргкамітэт, сумесна з Саюзам журналістаў, правёў неўзабаве пасля гэтага пасяджэння семінар кінарэцэнзентаў рэспубліканскіх і абласных газет.

У справаздачы паведамляецца аб колькасці праведзеных абмеркаванняў новых кінакарцін (15). Аднак аргкамітэт прызнае, што гэта — амаль адзіная форма работы, якая ўжывалася. Не было творчых дыскусій па праблемных пытаннях развіцця савецкага і беларускага кінамастацтва, не абмяркоўваліся сцэнарыі, не разглядаліся справы арганізацыі кінавытворчасці.

Аргкамітэт прызнае, што «вырашыць сваю галоўную задачу — рашуча ўплываць на вытворчасць і садзейнічаць стварэнню высокаідэйных і значных мастацкіх фільмаў яму не ўдалося». Прычыны?

Няма акрэсленага адказу на пытанне, як канкрэтна і ў якіх формах саюз можа і павінен уплываць на вытворчасць і адказваць за якасць фільмаў. Справа ў тым, што кінастудыі, як правіла, паказваюць аргкамітэту саюза гатовыя кінакарціны, калі позна ўжо прымаць якія б там ні было захады да выпраўлення мастацкіх хібаў.

У справаздачы аргкамітэта ставіцца пытанне аб тым, што Саюз кінематаграфістаў, калі ён нясе адказнасць за лёс кінапрадукцыі, павінен таксама мець і адпаведнае права ўплыву на яе вытворчасць.

Ставіцца пытанне і аб творчых секцыях на студыях, якія, на думку аргкамітэта, ад часу стварэння саюза страцілі сваё самастойнае значэнне. Закранаюцца і многія іншыя важныя пытанні. Усе яны разам з пытаннямі, узнятымі ў дакладзе аргкамітэта, выклікалі жывы абмен думкамі сярод дэлегатаў з'езда, які працягваўся два дні.

Першым выступіў у спрэчках адказны сакратар Саюза кінематаграфістаў Латвійскай ССР А. Аболіньш. Ён павіншаваў удзельнікаў з'езда ад імя кінематаграфістаў сваёй рэспублікі. Прыгадаўшы дружбу вялікіх песняроў нашых народаў — Яна Райніса, Янкі Купалы і Якуба Коласа, прамоўца гаварыў аб творчых сувязях беларускага і латышскага мастацтва.

— На Устаноўчым з'ездзе кінематаграфістаў Савецкай Латвіі, — сказаў ён, — ваш кінарэжысёр І. Шульман прапанаваў стварыць сумесны беларускі і латышскі мастацкі фільм. Гэтая прапанова выклікала жывую цікавасць і яе ідэя не павінна заняпасці. Магчыма, гэта будзе фільм аб дружбе Райніса і Купалы. Магчыма, гэта будзе фільм пра нашы сумесныя партызанскія шляхі або пра сённяшнія працоўныя справы, — але ясна адно: такі фільм павінен быць створаны.

Заслужаны дзеяч мастацтва БССР Л. Голуб, узяўшы слова пасля выступлення А. Аболіньша, зачытаў дэлегатам з'езда праект статута Саюза работнікаў кінематаграфіі СССР.

Начальнік Галоўнага ўпраўлення кінафікацыі і кінапракату Міністэрства культуры БССР П. Жукоўскі расказаў аб росце ў рэспубліцы дзяржаўнай кінасеткі, якая за апошнія пяць год павялічылася ўдвая. Пабудавана 67 гарадскіх кінатэатраў з агульнай колькасцю месц — 22 тысячы. У рэспубліцы працуе 5.300 кінаўстановак. Толькі за мінулы год іх наведала 115 мільёнаў гледачоў.

— Гэта, таварышы, без уліку той велізарнай колькасці гледачоў, — падкрэсліў прамоўца, — якія глядзяць фільмы па тэлебачанню.

П. Жукоўскі спыніўся ў сваёй прамове на тэхнічным прагрэсе кінапракатнай базы: рэспубліка мае 60 шырокаэкранных кінатэатраў, два шырокафарматныя — у Мінску і Гродна (неўзабаве ўступае ў строй трэці — у Магілёве); у чатыры разы павялічылася колькасць сельскіх стацыянарных установак, удзельная вага якіх у агульнай сетцы складае зараз амаль 50 працэнтаў.

— Пройдзе яшчэ два-тры гады, — паведаміў П. Жукоўскі, — і ў сельскай мясцовасці мы цалкам пяройдзем на стацыянарныя кінаўстаноўкі, што значна палепшыць якасць дэманстравання фільмаў.

Далей прамоўца спыніўся на грамадскіх формах арганізацыі работы кінасеткі — клубах аматараў кіно, рэпертуарных камісіях, саветах кінатэатраў і інш.

Гаворачы пра вопыт арганізацыі паказу сельскагаспадарчых фільмаў у калгасах Гомельскай вобласці, які распаўсюджваецца па рэспубліцы і нават стаў здабыткам усёй краіны, П. Жукоўскі крытыкаваў Мінскую студыю навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў за тое, што яна мала стварае карцін на сельскагаспадарчую тэматыку.

— Справа тут у недасканаласцях тэматычнага планавання нашай работы, — нібы адказвае П. Жукоўскаму ў сваім выступленні рэжысёр-аператар студыі І. Вейняровіч.

Прыгадаўшы канкрэтныя прыклады, ён расказаў, як сама працэдура ўзгадненняў і зацвярджэнняў плана ў розных інстанцыях часам перашкаджае адлюстраванню жыццёва патрэбнай тэмы.

І. Вейняровіч сказаў далей, што рэспубліканскі перыядычны друк мала аддае ўвагі дакументальнаму кіно. Ён крытыкаваў таксама аўтараў кнігі «Гісторыя беларускага кіно» за тое, што ў іх даследаванні пытанням дакументальнага кіно адведзена вельмі нязначнае месца.

Далей І. Вейняровіч палемізаваў з аўтарамі надрукаванага ў газеце «Літаратура і мастацтва» артыкула «Няхай гэта будзе «апошні хутар». Няўдачу маладых аўтараў фільма «Апошні хутар» ён бачыць не ў тым, што мастацкі савет студыі ўмешваўся ў работу маладых кінематаграфістаў, а ў тым, што яны «не ўмеюць бачыць жыццё».

— Можна вылавіць ідэю новага сяла і праз кантраст псіхалогіі хутаранына з новым жыццём, — гаворыць прамоўца. — Але нельга апраўдваць матывы аднаасобніцтва, спачуваць яму. А такая небяспека ў фільме была, і мастацкі савет студыі справядліва ўказаў на яе. Шкада, што аўтары не знялі новы фільм, а абмежаваліся выкарыстаннем ужо гатовых кадраў са старых кінастужак. Таму іх і напаткала няўдача.

Навуковы супрацоўнік Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР Г. Тарасевіч прысвяціў сваё выступленне пытанню развіцця кінакрытыкі.

— Далейшы росквіт прафесіянальнага і самадзейнага кінамастацтва ў рэспубліцы, — сказаў ён, — немагчымы без глыбокага і ўсебаковага асэнсавання і ўліку ўсяго папярэдняга творчага вопыту нашых кінематаграфістаў.

— У перадваенныя гады, — працягвае прамоўца, — у перыядычным друку было апублікавана некалькі артыкулаў і нарысаў, аўтары якіх намагаліся вызначыць творчы напрамак беларускага кіно, яго ідэйна-эстэтычныя канцэпцыі. Аднак усе яны (дарэчы, нярэдка супярэчлівыя ў асвятленні і ацэнках канкрэтных з'яў) даўно сталі бібліяграфічнай рэдкасцю. Што ж датычыць нешматлікіх пасляваенных публікацый і асобных даследаванняў тэарэтычнага характару, дык яны таксама не даюць патрэбнага адказу на надзённыя пытанні.

Адну з найбольш надзённых задач кінакрытыкі прамоўца бачыць у словах нядаўняй пастановы ЦК КПСС, дзе гаворыцца аб неабходнасці папярэджвання магчымых зрываў і няўдач працаўнікоў кіно. Ён лічыць таксама вельмі надзённай праблему нацыянальнага аблічча твораў, што выпускаюцца на беларускіх кінастудыях. Вырашэнне гэтай праблемы, гаворыць Г. Тарасевіч, шмат у чым залежыць ад творчых кадраў нацыянальнага кінематографа.

— У нас мала кінаработнікаў, якія б глыбока ведалі гісторыю беларускага народа, яго мову, культуру, літаратуру і мастацтва, народную творчасць, — цвярджае прамоўца. — Ці не таму пацярпелі няўдачу фільмы «Новы дом» і «Пасеялі дзяўчаты лён», што аўтар абодвух гэтых сцэнарыяў Я. Памешчыкаў меў цьмянае ўяўленне аб жыцці, пра якое ён браўся пісаць, не ведаў матэрыялу.

У пацвярджэнне сваёй думкі Г. Тарасевіч прыгадаў і гісторыю з фільмам «Несцерка», якому таксама неставала народнасці. У канцы сваёй прамовы Г. Тарасевіч узняў акцёрскую праблему ў кінавытворчасці.

Гэтай праблеме — акцёр у кіно — прысвяціла сваё выступленне і актрыса Сільвія Сяргейчыкава, якая вітала з'езд ад імя кінематаграфістаў Украіны.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

ТРОХІ НЕ У ФОКУСЕ...

Сяброўскія шаржы А. САКАЛОВА.

Ул. Корш-Саблін

А. Куляшоў

А. Макаёнак

ДНІ чэхаславацкай культуры

СУСТРЭЧЫ ДРУЖБЫ

У свята непарушнай дружбы ператварыліся Дні чэхаславацкай культуры ў Беларусі. Куды б ні прыйшлі госці — на завод ці ў калгас, ва ўстанову ці ў школу — усюды яны сустракалі сяброўскі, шчыры прыём. Гасцей цікавіць усё: і развіццё прамысловасці рэспублікі, і работа дзіцячых устаноў, і сельская гаспадарка, і новыя працы беларускіх вучоных. Пра ўсё гэта ім падрабязна расказвалі з вялікім задавальненнем.

Адна з сустрэч адбылася у Міністэрстве культуры БССР. Сюды прыйшла вялікая група актывістаў Саюза чэхаславацка-савецкай дружбы, сярод якіх былі пісьменнікі, мастакі, работнікі ўстаноў культуры Чэхаславакіі. Намеснік міністра культуры М. Мінковіч пазнаёміў гасцей з работай міністэрства, расказаў аб буйнейшых установах культуры рэспублікі. Старшыня Саюза кампазітараў БССР Я. Цікоцкі, намеснік міністра асветы БССР М. Мурашка, работнікі Міністэрства культуры БССР і госці абмяняліся думкамі аб устанаўленні больш цесных сувязей паміж работнікамі культуры Беларусі і Чэхаславакіі.

Нашых гасцей зацікавіла творчае жыццё беларускіх студэнтаў і навуковых супрацоўнікаў. У Мінскім педагагічным інстытуце імя М. Горкага адбыўся вечар сустрэчы з дарагімі гасцямі. Чэхаславацкіх сяброў горача вітаў паэт Пятро Глебка. Аб брацкіх сувязях беларускай і чэхаславацкай літаратуры расказаў навуковы супрацоўнік Інстытута літаратуры імя Янкі Купалы Акадэміі навук БССР А. Мажэйка. Затым выступілі беларускія пісьменнікі. І. Мележ падзяліўся ўражаннямі аб паездцы ў Чэхаславакію. Паэты П. Макаль, С. Шушкевіч прачыталі ў перакладах на беларускую мову творы чэхаславацкіх паэтаў. Чэхаславацкія пісьменнікі Браніслаў Хама і Францішак Браніслаў перадалі студэнтам шчырае прывітанне ад братняга народа.

У першыя дні госці пазнаёміліся з выдатнымі мясцінамі беларускай сталіцы, наведалі Домм-узей І з'езда РСДРП і Літаратурны музей Якуба Коласа. У мінскім кінатэатры «Цэнтральны» адбылося адкрыццё фестывалю чэхаславацкіх фільмаў. На ім прысутнічала група актывістаў Саюза чэхаславацка-савецкай дружбы, Намеснік міністра культуры БССР Р. Мачулін ва ўступным слове расказаў аб цікавасці беларускага гледача да твораў кінамастацтва Чэхаславакіі. Ён адзначыў, што за апошні час у кінатэатрах Беларусі дэманстравалася 14 фільмаў чэхаславацкіх студый. На адкрыцці кінафестывалю быў паказаны фільм — «Небяспечны ўзрост».

Сяброўскія сустрэчы адбыліся ў тэатральна-мастацкім інстытуце, Доме культуры будтрэста № 5, у клубе цагельнага завода № 2.

Не толькі ў сталіцы адбыліся сустрэчы з дарагімі гасцямі. Прадстаўнікоў братняй савецкай літаратуры сустракалі працоўныя Віцебска ў Палацы культуры мясцовай прамысловасці.

Другая група гасцей наведала Магілёў і пазнаёмілася з работай буйнейшага прадпрыемства — завода пад'ёмна-транспартнага абсталявання імя Кірава. Сябры з Чэхаславакіі пабывалі ў Гомелі. Там адбыліся вялікія вечары дружбы.

У абласных цэнтрах рэспублікі, у раённых бібліятэках і калгасах экспануюцца фотавыстаўкі, мантажы, стэнды аб дасягненнях брацкага чэхаславацкага народа.

У наступныя дні госці працягвалі азнаямленне з жыццём рэспублікі. Яны пабывалі ў калгасах імя Гастэлы Мінскага раёна і «Рассвет» Кіраўскага раёна, наведалі Дзяржаўны мастацкі музей БССР, прысутнічалі на вялікім канцэрце ў Беларускай дзяржаўнай кансерваторыі, пабывалі на прадпрыемстве камуністычнай працы — Віцебскім дывановым камбінаце.

У нядзелю ў сталіцу Беларусі прыйшла эстафета культуры Масква—Прага, прысвечаная месячніку савецка-чэхаславацкай дружбы. Яе перадалі спартсмены Магілёўшчыны. Матацыклісты сталіцы перададуць эстафету спартсменам Украіны.

Да Дзён чэхаславацкай культуры Дзяржаўнае выдавецтва БССР выдала дзве кнігі аб сумеснай барацьбе беларускіх і чэхаславацкіх партызан у гады Вялікай Айчыннай вайны — зборнік «Агні партызанскай дружбы» і кніга успамінаў І. Вятрова «Браты па зброі».

Беларускія пісьменнікі і госці з Чэхаславакіі (злева направа): Іван Шамякін, чэшскі мастак Багуслаў Ягр, чэшскі пісьменнік Браніслаў Хама, Іван Мележ, чэшскі паэт Францішак Браніслаў, Пятро Глебка, Пятрусь Макаль.

Фота І. ЗМІТРОВІЧА. БЕЛТА.

У Мінскім Палацы піянераў адбылася сустрэча піянераў з чэхаславацкімі гасцямі.
Мастаку Францішку Гросу піянеры прыкалолі значок.
Фота У. ЛУПЕЙКІ. БЕЛТА.

З КЛОПАТАМ ПРА ЗАЎТРАШНІ ДЗЕНЬ МАСТАЦТВА

ПЕРШЫ З'ЕЗД БЕЛАРУСКІХ КІНЕМАТАГРАФІСТАЎ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

Ад Ленінградскага аддзялення Саюза савецкіх кінематаграфістаў з'езд вітаў рэжысёр студыі «Ленфільм» А. Гранік. Жадаючы творчых поспехаў работнікам беларускага кіно, ён падкрэсліў думку аб тым, што кожная ўдача той ці іншай нацыянальнай студыі — гэта заўсёды агульны здабытак усяго атрада савецкіх кінамастакоў.

— Саюз кінематаграфістаў сваім нараджэннем павінен спрыяць павелічэнню колькасці нашых удач,— сказаў прамоўца.—Ён усё больш і больш будзе ўплываць на творчае і вытворчае жыццё нашых студый.

— У дакладзе аргкамітэта саюза чамусьці была зусім абмінута праблема гуку ў кіно,—пачаў сваё выступленне гукааператар Ул. Усціменка.—І гэта не выпадкова. Роля гуку ў кіно ў нас мала вывучаецца і слаба ўлічваецца. Яе занядбалі і сцэнарысты, і рэжысёры. Маўчыць аб ёй крытыка. Нават мастацкія саветы студый пазбягаюць аналізу гукавога ўспрыняцця фільма.

Ул. Усціменка лічыць гэтую з'яву нечым накшталт прафесіянальнага «атавізму», што захаваўся з часоў нямога кіно. Спасылаючыся на канкрэтныя эпізоды з фільмаў «Авадзень» і «Аповесць палымяных гадоў», прамоўца даводзіць, што гук—адзін з неад'емных кампанентаў у сінтэтычным мастацтве кінематографа.

— Калі кінематаграфісты пасапраўднаму прымуць на ўзбраенне новыя выразныя сродкі гукавога кіно,— працягвае ён,—гэта дасць свой плён і ў вырашэнні кінапраблемы нумар адзін—сцэнарнай. У кінадраматургію прыйдуць новыя аўтары, у якіх развіта не толькі зрокавае ўспрыняццё рэчаіснасці, але і слыхавое, якія ўмеюць прыслухоўвацца да жыцця, мысліць гукавымі кампанентамі, знаходзіць яскравыя вобразныя дэталі ў гуку і, нарэшце, будаваць з гукавых вобразаў эпізоды і нават цэлыя фільмы.

У занядбанні гуку ў кіно Ул. Усціменка вінаваціць перш за ўсё акцёраў і рэжысёраў.

— Калі мы гаворым акцёру: «інтымней», ён робіць—«цішэй», калі гаворыцца «цяплей, больш мякка» (улюбёныя тэрміны шматлікіх рэжысёраў),—акцёр зноў-такі робіць «цішэй»... І ўсё гэта тлумачыцца гарачым імкненнем да таго, каб героі былі на экране натуральнымі, незвязанымі з мікрафонам, каб яны размаўлялі проста, нібы ў жыцці.

— Аднак натуральнасць дыялогу ў павільёне абарачваецца ненатуральнасцю на экране, — даводзіць Ул. Усціменка. — Каб пазбегнуць гэтага, выканаўца павінен выявіць асаблівае майстэрства кінаакцёра, а не выкарыстоўваць звычайныя тэатральныя каноны. Гэта — адна з умоў вырашэння кінапраблемы нумар два — праблемы самога акцёра.

Кінапраблемай нумар тры Ул. Усціменка лічыць праблему гукааператара. Ён з хваляваннем і заклапочанасцю адзначае той факт, што ў сучасны момант ні адна з навучальных устаноў краіны не займаецца падрыхтоўкай спецыялістаў па мастацкім гуказапісе.

— Неабходна стварыць спецыяльны факультэт — гукавы, які б рыхтаваў спецыялістаў — гукааператараў з вышэйшай адукацыяй,—прапануе Ул. Усціменка. — Калі Дзяржаўны інстытут кінематаграфіі адкрые такі факультэт, можна будзе спадзявацца, што з цягам часу гукавое кіно створыць новыя шедэўры, што гук перастане быць для рэжысёраў і аператараў нечым накшталт «другой рэспублікі».

Затым выступіў рэжысёр Мінскай студыі навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў Ул. Стральцоў. Асноўную частку сваёй прамовы ён прысвяціў творчасці моладзі. Гаворачы пра прыток новых сіл, ён заклікаў адначасова не забывацца на творчых работнікаў старэйшага пакалення.

Праблему моладзі Ул. Стральцоў разумее як праблему адшукання і росту талентаў, якія здольны стварыць новыя, цікавыя кінатворы. Спасылаючыся на практыку Мінскай студыі кінахронікі, ён даводзіў, што маладосць сама па сабе яшчэ не гарантуе поспеху. Ул. Стральцоў назваў рад сучасных тэм, якія былі даручаны маладым кінематаграфістам, але не знайшлі належнага ўвасаблення.

Ул. Стральцоў крытыкаваў таксама сістэму тэматычнага планавання, якая існуе на кінахроніцы. Ён выказаў пажаданне, каб Саюз кінематаграфістаў стаў сапраўды творчай арганізацыяй, дзе б абмяркоўваліся і каардынаваліся самыя надзённыя праблемы кінамастацтва, у тым ліку і пытанні творчых узаемаадносін паміж мастакамі малодшага і старэйшага пакалення.

Аб творчай смеласці, аб высокім грамадскім абавязку мастака гаварыў у сваім выступленні рэжысёр і сцэнарыст М. Фігуроўскі. Ён заклікаў адмовіцца ад арыенціроўкі на няпэўную «сярэдзіну» пры ацэнцы кінатвораў.

— Крытэрыем ацэнак твора, —гаворыць прамоўца, —павінны стаць перш за ўсё яго мастацкасць і задума, якая дае магчымасць творцу брацца за надзённыя пытанні грамадскага жыцця, раскрываць іх з новай сілай, з нязвыклай для вока і слыху вастрынёй.

У якасці прыкладаў мужнага пранікнення ў жыццё ён прывёў такія фільмы апошніх гадоў, як «Лёс чалавека», «Чыстае неба», «Дзевяць дзён аднаго года», «Людзі і звяры».

— Натуральна, што мужнасць і адвагу нельга выявіць на пратаптаных дарогах, забяспечаных адпаведнымі правіламі бяспекі, — развівае сваю думку М. Фігуроўскі. — Таму таварышы, якія часам скардзяцца на перашкоды, што нібыта замінаюць ім праявіць сваю смеласць, забываюцца на тое, што смеласць у тым і заключаецца, каб пераадольваць перашкоды.

— Мужнасць павінна адпавядаць мэце, — працягвае і ўдакладняе прамоўца. — І горы намаганняў могуць нарадзіць чарговую «шэрую мыш», калі прычынай дзеянняў мастака не будзе высокая грамадзянская думка, жаданне прынесці карысць народу ў яго складанай і цяжкай барацьбе за пабудову камунізма.

Прамоўца гаворыць пра злоўжыванні і самавольства, што панавалі ў часы культу Сталіна і карадзілі вельмі жывучую інерцыю прызвычаенасці да гатовых формул, апрабіраваных меркаванняў і штампаваных вобразаў, нарадзілі боязь вастрыні, страх перад складанай і супярэчлівай праўдай жыцця.

— Калі б гэтыя якасці захаваліся толькі ў канцылярыях— было б паўбяды. Галоўныя прычыны нашага няўмення яскрава і шматгранна адлюстроўваць жыццё — у нас саміх,— падкрэсліў М. Фігуроўскі. — Наша адставанне прыкметна не толькі ў параўнанні з лепшымі фільмамі апошніх год, але галоўным чынам у параўнанні з магутным развіццём грамадскага жыцця, абуджанага свежым паветрам трох вялікіх з'ездаў партыі, якія надоўга вызначылі кірунак жыцця краіны. Вось ад чаго мы адстаём у першую чаргу.

Прыгадаўшы адзін з апошніх вершаў Я. Еўтушэнкі, змешчаны ў «Правде», М. Фігуроўскі заярнуўся да сваіх калег — удзельнікаў з'езда:

— А ці не ў «нашчадках Сталіна», што прыстасаваліся да новых фармуліровак, ходзім мы —вось галоўнае пытанне, якое павінен задаць сабе кожны мастак. Страх перад новым, паўтарэнне даўно ўсім вядомых ісцін, нецярпімасць да нязвыклай вастрыні ў пастаноўцы жыццёвых пытанняў або ў мастацкай форме, боязь усялякага руху думкі—усе гэтыя вынікі культу асобы Сталіна шмат у чым вызначаюць прычыну нашых адставанняў.

У сувязі з гэтым М. Фігуроўскі спыніўся на праблеме наватарства і выкарыстання традыцый:

— Лепшай традыцыяй і класічнага, і савецкага мастацтва заўсёды было імкненне да новага, імкненне да пошукаў, барацьба з эпігонствам і перайманнем. Такія традыцыі трэба ахоўваць!

— Аднак, — гаворыць прамоўца, — некаторыя таварышы блытаюць традыцыі з перайманнем. А ў дачыненні да наватарства яны ўзялі на ўзбраенне прыстаўку «ілжэ», якая мела шырокі ўжытак у часы культу Сталіна, і карыстаюцца ёю вельмі неасцярожна. Гэткая «маркіроўка» і «перастрэлка ярлыкамі» сёння запалохаць ужо не можа нікога, але духоўную траўму нанесці можа.

У якасці прыкладу М. Фігуроўскі прыгадаў выступленне на з'ездзе І. Вейняровіча з крытыкай у адрас аўтараў артыкула «Няхай гэта будзе «апошні хутар», што быў апублікаваны ў газеце «Літаратура і мастацтва». Прамоўца стаў таксама на абарону творчасці маладых аператараў «Беларусьфільма» А. Забалоцкага і Ю. Марухіна, чые пошукі ў галіне мастацкай формы, на яго думку, няправільна зразумелі некаторыя таварышы па студыі.

— Творчыя супярэчнасці ў час актыўных пошукаў,—гаворыць М. Фігуроўскі,—справа натуральная. Яны характэрныя і для іншых студый. У іх—прычына ўзнікнення творчых аб'яднанняў на студыях.

Аднак паўстае пытанне: ці з'яўляецца наша кінастудыя дастатковым сілавым аб'ектам, каб можна было вамкнуць у яе межах творчую садружнасць асобных груп мастакоў? Ці не павядзе гэта да самазаспакоенасці і застою?

На думку М. Фігуроўскага, наўрад ці мэтазгодна разбіваць студыю на два-тры карліканы аб'яднанні. Ён прапанаваў прадумаць магчымасць стварэння ўсесаюзных аб'яднанняў кінематаграфістаў — на падставе адзінства мастацкіх поглядаў, напрамкаў і школ.

— У нас ужо склалася некалькі моцных творчых аб'яднанняў у Маскве. Але яны пакуль што існуюць толькі ў рамках студый і аб'ядноўваюць толькі людзей, якія працуюць на гэтых студыях. А чаму б ім (аб'яднанням) не мець свае філіялы на рэспубліканскіх і перыферыйных студыях?

М. Фігуроўскі лічыць, што такія аб'яднанні здолеюць дзейсна вырашаць шматлікія пытанні, якія на працягу многіх год студыі намагаліся вырашыць шляхам прызначэння штатных мастацкіх кіраўнікоў.

— У аб'яднаннях іаксама будуць мастацкія кіраўнікі, — гаворыць ён. — Аднак гэта будзе такое мастацкае кіраўніцтва, якое кожны мастак сам сабе выбірае, з якім яму лёгка і радасна працаваць, бо ёсць агульная мова, якую ён добра разумее.

У стварэнні такіх аб'яднанняў М. Фігуроўскі бачыць вырашэнне праблемы ўзаемасувязей паміж мастакамі розных рэспублік, якую не мог вырашыць да гэтага часу аргкамітэт Саюза кінематаграфістаў СССР, нягледзячы на неаднаразовыя рашэнні і пастановы.

Думкі, выказаныя М. Фігуроўскім, горача падтрымаў народны артыст СССР Сяргей Герасімаў, які перад пачаткам сваёй прамовы зачытаў зварот прэзідыума аргкамітэта Саюза кінематаграфістаў СССР да з'езда кінаработнікаў Беларусі.

Адзначыўшы, што семдзесят працэнтаў усёй кінапрадукцыі Саюза робіцца на рэспубліканскіх кінастудыях і што па сутнасці іх поспех вызначае, у канчатковым выніку, агульную карціну жыцця савецкага кінамастацтва, С. Герасімаў сказаў:

— Без павышэння мастацкай якасці кінафільмаў, што выпускаюцца на рэспубліканскіх студыях, мы не здолеем пасапраўднаму адказаць на пастанову Цэнтральнага Камітэта партыі аб кінамастацтве.

Як выканаць гэтую задачу?

Адказваючы на гэта пытанне, С. Герасімаў прыгадаў ранейшую практыку адкамандзіравання майстроў кіно з Масквы на перыферыйныя студыі з паўнамоцтвам і адказнасцю за выпуск той ці іншай карціны.

— Але гэта было магчымым, калі ў краіне выпускалася 10—15 фільмаў у год. Цяпер жа, калі мы ствараем 120 карцін, гэта нерэальна. Акрамя таго,— гаворыць С. Герасімаў, — такая практыка не спрыяла б правільнаму правядзенню прынцыпаў нашай нацыянальнай палітыкі ў галіне мастацтва: яна азначае падмену нацыянальных кадраў сталічнымі гастралёрамі.

Далей С. Герасімаў спыніўся на некаторых творчых праблемах і, у прыватнасці, на праблеме станоўчага героя ў сучасным кінамастацтве. Шмат увагі ў яго выступленні было ўдзелена таксама выхаванню кінематаграфічнай змены ў Дзяржаўным інстытуце кінематаграфіі, прафесарам якога з'яўляецца С. Герасімаў.

— Цэльнасць мастацкай натуры і мастацкіх ідэй мае вялікае значэнне для агульнакамуністычнай справы, — гаворыць прамоўца. — Таму думкі і настрої, што нараджаюцца ў моладзі, сярод яе і вакол яе, патрабуюць глыбокага даследавання і актыўнага ўздзеяння з нашага боку. Я не магу згадзіцца, калі на дыспуце аб мове мастацтва прадметам абмеркавання на працягу пяці гадзін становіцца стыль і манера фільма «Хіросіма, каханне маё» і ні слова не гаворыцца аб рабоце Даўжэнкі. Я не магу ўсур'ёз прымаць размовы аб нейкай «агульнасці» развіцця кінематаграфічнай мовы, бо ніякія школы і напрамкі не нараджаюцца ў адрыве ад жыццёвага матэрыялу. Усялякая форма — сугуба нацыянальная, сугуба класавая.

У заключэнне С. Герасімаў падзяліўся сваімі ўражаннямі ад прагляду кінаматэрыялаў новых фільмаў, якія рыхтуюцца на студыі «Беларусьфільм».

Рэжысёр студыі «Беларусьфільм» П. Васілеўскі пачаў сваё выступленне з крытыкі дзейнасці аргкамітэта Саюза кінематаграфістаў. Спаслаўшыся на змешчанае ў дакладзе і справаздачы прызнанне аб тым, што аргбюро не здолела ўплываць на рост кінематаграфіі, прамоўца сказаў:

— Я лічу, што дзейнасць аргбюро не вытрымлівае аніякай крытыкі, бо работы па сутнасці не было. Творчыя секцыі студый праводзілі сваю работу без удзелу аргбюро саюза. Задача нашага з'езда ў тым, каб выпрацаваць формы работы саюза намеціць канкрэтныя мерапрыемствы.

Прыгадаўшы пісьмо ўкраінскай калгасніцы Н. Заглады, П. Васілеўскі заклікаў дэлегатаў прымаць на грамадскіх асновах самы актыўны ўдзел у жыцці саюза, «каб за нас не працавалі толькі тыя, каго мы тут выбярэм, хто будзе займаць платныя пасады». Менш афіцыяльнасці, больш творчасці — у гэтым асноўная думка прамоўцы адносна форм работы новага саюза. Больш таварыскіх сустрэч і абмеркаванняў (не проста праглядаў!) кінакарцін. Больш прынцыповых размоў аб новых задумах!

Намеснік старшыні праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Іван Шамякін сваё выступленне прысвяціў задачам, якія стаяць сёння перад усімі галінамі мастацтва і асабліва перад кінематографам.

— Напэўна, кожны з нас задумваўся неаднойчы: што ж патрэбна, каб напісаць добры раман, паставіць выдатны фільм, які б усхваляваў мільёны людзей? Безумоўна, для гэтага неабходны талент. Адсутнасць яго, аднак, часта вельмі неахвотна прызнаецца людзьмі. Чамусьці лічыцца крыўдным сказаць чалавеку, што ў яго няма таленту. У нас у літаратуры з гэтым шмат клопату. Я лічу, што кічо мае магчымасці не пускаць у гэтае «святая святых» — у наша мастацтва — людзей, якіх бог абмінуў талентам.

Падкрэсліўшы складанасць і працаёмкасць работы пісьменніка ў кінематографе, І. Шамякін зазначыў, што сапраўдная творчая ўдача вянчае гэтую працу толькі тады, калі аўтар смела ўмешваецца ў жыццё.

— У перыяд культу асобы шмат каму з нас, мастакоў, неставала гэтай смеласці, і таму, напэўна, так мала было творчых удач. Цяпер партыя дала нам права на смеласць і ў нас павінны быць удачы. І я ўпэўнен, што яны будуць.

Прамоўца падкрэсліў неабходнасць глыбокага вывучэння жыцця мастаком. Гэтае патрабаванне ён асабліва адрасаваў моладзі, якая прыходзіць да творчай працы са сцен ВНУ.

Іван Шамякін перадаў ад пісьменніцкай арганізацыі рэспублікі прывітанне з'езду і пажадаў усім членам новага саюза плённых поспехаў у творчай працы.

— Мяне глыбока ўсхвалявалі праблемы і пытанні, узнятыя ў выступленнях М. Фігуроўскага і С. Герасімава, — пачаў сваю прамову дырэктар кінастудыі «Беларусьфільм» заслужаны дзеяч мастацтва БССР І. Дорскі. — Я рады, што сёння мы можам гаварыць не пра тое, што нам неабходны сцэнарыі ці рэжысёры, каб выканаць якнебудзь гадавы план, а можам ставіць вялікія творчыя праблемы перспектыўнага развіцця нашага мастацтва.

Прамоўца выказаў спадзяванні, якія ўскладае студыя на саюз у справе стварэння належнай творчай атмасферы сярод кінаработнікаў. Шмат увагі ў яго выступленні было адведзена працы маладзёжнага аб'яднання, сам факт стварэння якога выклікаў шмат спрэчак напярэдадні з'езда і ў выступленнях са з'ездаўскай трыбуны.

— Пры стварэнні гэтага аб'яднання мы зыходзілі з неабходнасці ўзаемадапамогі сярод моладзі, якая прыйшла да нас з інстытута кінематаграфіі. Аб'яднанне патрэбна, каб таварышы ў ім дапамагалі адзін аднаму проста і шчыра.

— Магчыма, — працягвае І. Дорскі, — няўдала выбрана назва гэтага аб'яднання — «Маладзёжнае». Але я не бачу ў гэтым ніякага супрацьпастаўлення яго членаў старэйшым майстрам.

І. Дорскі зрабіў сур'ёзны папрок аргкамітэту саюза за тое, што ён ніяк не падтрымаў аб'яднанне, заняў нейтральную пазіцыю да гэтай новай, безумоўна, цікавай з'явы.

Прамоўца выказаў сваю нязгоду з палажэннем даклада аргкамітэта, у якім даюцца настойлівыя рэкамендацыі «прымацоўваць» да маладых рэжысёраў вопытных акцёраў і аператараў. Спасылаючыся на прыклады з практыкі «Беларусьфільма», ён даводзіў, што гэта не заўсёды прыносіць жаданыя вынікі: «масціты» выканаўца звычайна не прызнае аўтарытэту пачынаючага пастаноўшчыка фільма і г. д.

— Малады мастак сам знойдзе сабе настаўніка-майстра. І ён яго знаходзіць. Часам ён нават вучыцца ў тых майстроў, якія не падазраюць аб гэтым,— вучыцца на іх памылках.

Дырэктар студыі закончыў сваю думку аб узаемаадносінах моладзі і майстроў словамі з верша паэта Яўгенія Вінакурава:

Художник, научи ученика,
Чтоб было у кого потом
учиться.

Далей І. Дорскі паведаміў аб тым, што студыя ў бліжэйшы час запускае ў вытворчасць пяць фільмаў па сцэнарыях беларускіх аўтараў. Побач з гэтым ён гаварыў аб праве студыі набываць і ставіць сцэнарыі, напісаныя аўтарамі іншых рэспублік.

Прамоўца выказаў пратэст у адрас «Масфільма», які, нягледзячы на свае абавязацельствы і абяцанні, праяўляе абсалютную пасіўнасць у справе шэфства над студыяй «Беларусьфільм». Ён звярнуўся да С. Герасімава, як да намесніка старшыні прэзідыума аргкамітэта Саюза кінематаграфістаў СССР з просьбай паспрыяць ажыццяўленню вырашанага па сутнасці пытання аб сумеснай з «Масфільмам» пастаноўцы кінакарціны.

У якасці прапановы І. Дорскі выказаў думку аб неабходнасці стварэння пры Саюзе кінематаграфістаў СССР каардынацыйнага цэнтра, праз які студыі маглі б знаходзіць адпаведных рэжысёраў на пастаноўку таго ці іншага сцэнарыя.

Ад імя тэатральнай грамадскасці рэспублікі і прэзідыума Беларускага тэатральнага аб'яднання дэлегатаў з'езда горача вітала народная артыстка СССР Л. Александроўская.

Адказваючы на пажаданні кінематаграфістаў мець свой Дом кіно, яна абвясціла, што ў Мінску неўзабаве павінен адкрыцца Дом работнікаў мастацтва, памяшканне якога будзе прадастаўлена і майстрам кіно для іх творчых мерапрыемстваў.

Рэжысёр Мінскай студыі навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў П. Шамшур сваё выступленне прысвяціў праблеме сцэнарыяў дакументальнага кіно. Ён указаў на ненармальнасць становішча, калі студыя з-за фінансавых абмежаванняў не можа выкарыстоўваць права на замацаванне аўтара за пастаноўчай групай на ўвесь перыяд здымак. У гэтых адносінах Мінская студыя чамусьці пазбаўлена магчымасцей, якімі карыстаюцца іншыя студыі: каштарыс на вытворчасць фільма ў яе ўдвая меншы ў параўнанні з імі.

П. Шамшур далучыўся да выказвання І. Вейняровіча аб недасканалай сістэме тэматычнага планавання вытворчасці фільмаў.

Закрануўшы пытанні кінакрытыкі, прамоўца прапанаваў абмеркаваць іх на праўленні саюза сумесна з Міністэрствам культуры БССР. Ён выказаў сур'ёзныя заўвагі па кнізе А. Красінскага, В. Смаля і Г. Тарасевіча «Гісторыя беларускага кіно» і прапанаваў, каб па ёй была праведзена дыскусія.

Гаворачы аб прапагандзе творчасці беларускіх кінематаграфістаў, П. Шамшур рэзка крытыкаваў перадачы Мінскай студыі тэлебачання за няўдалыя, на яго думку, гутаркі, якія праводзіць студыя з кінарэжысёрамі і аператарамі: яны аднастайныя і нагадваюць штосьці накшталт самарэкламы.

Кінарэжысёр «Беларусьфільма» І. Шульман гаварыў аб значэнні ліпеньскай пастановы ЦК КПСС для развіцця і ўздыму кінематаграфіі.

Звяртаючыся да спрэчак адносна моладзі і старэйшых майстроў, І. Шульман далучыўся да думкі прамоўцаў, якія лічаць уяўнай саму праблему, як нейкі канфлікт.

— Гэта зусім натуральная з'ява, калі прыходзіць моладзь і займае месцы старых. Гэта — дыялектычны закон нашага жыцця, так яно было і так яно будзе. Але я хачу сказаць адно нашай моладзі: не трэба «надзяваць штаны праз галаву». Трэба перш за ўсё думаць пра складанасць жыцця і шукаць сродкі для яго выяўлення. І яшчэ — не трэба выхоўваць у сабе пагардлівасць да працы і творчасці іншых.

Рэдактар Галоўнага ўпраўлення па вытворчасці фільмаў Міністэрства культуры СССР Т. Юрэнева, выказаўшы задаволенасць канкрэтнасцю і змястоўнасцю размовы, якая вядзецца дэлегатамі з трыбуны Першага Устаноўчага з'езда беларускіх кінематаграфістаў, падзялілася сваімі ўражаннямі ад становішча спраў на студыі «Беларусьфільм».

— Працэсы, якія тут адбываюцца, характэрныя і для іншых студый краіны. Я думаю, што мы не толькі вяртаемся да рэалізму, ад якога адышлі ў адпаведныя гады, але і ўступаем у яго новую стадыю, калі канкрэтнасць і глыбіня даследавання жыцця іншыя, чым раней.

Т. Юрэнева выказала задаволенасць тым, што атрад маладых кінематаграфістаў, які ўліўся ў калектыў Беларускай студыі, пачынае добра сябе праяўляць. Яна адзначыла работы Р. Віктарава і Ул. Турава.

— Мне шкада, — гаворыць прамоўца, — што ў дакладзе аргбюро некалькі пагардліва ацэнена карціна «Маленькія летуценнікі». Яе трэцяя навела, зробленая рэжысёрам Ул. Туравым, сведчыць аб тым, што гэта чалавек са сваім ладам мыслення, таленавіты і сур'ёзны.

Т. Юрэнева вітала стварэнне на «Беларусьфільме» маладзёжнага аб'яднання. Разам з тым яна падтрымала ідэю аб арганізацыі міжстудыйных творчых аб'яднанняў.

Ідэя аб стварэнні міжстудыйных творчых аб'яднанняў была таксама горача падтрымана рэжысёрам «Беларусьфільма» Р. Віктаравым.

— Мне здаецца, — сказаў ён, — гэта дапаможа Саюзу кінематаграфістаў цясней згуртаваць паміж сабой усіх работнікаў савецкага кіно і неабавязкова, каб цэнтры такіх аб'яднанняў былі толькі ў Маскве. Яны могуць быць і ў Мінску, і ў іншых гарадах.

Р. Віктараў выказаў шкадаванне з прычыны таго, што ў дакладзе не зусім дакладна асветлена работа маладзёжнага аб'яднання «Беларусьфільма».

— Мы не думалі размяжоўвацца, аддзяляць сябе ад старэйшага пакалення, таму што гэтае пакаленне нас выхавала і вучыла ў інстытуце кінематаграфіі. У нашым аб'яднанні сабраліся людзі з пэўнымі густамі, патрабаваннямі да мастацтва, да саміх сябе. Зараз нават няма неабходнасці настойваць на назве аб'яднання — «Маладзёжнае». Мы запрашаем да сябе ўсіх творчых работнікаў, якія хацелі б удзельнічаць у нашым аб'яднанні і гатовы падтрымліваць яго творчыя прынцыпы і інтарэсы.

З'езд віталі: ад малдаўскіх кінематаграфістаў — К. Козуб, ад Літвы — А. Моцкус.

На з'ездзе выступіў намеснік міністра культуры БССР М. Мінковіч. Ён заклікаў кінаработнікаў рэспублікі ў поўнай меры выкарыстоўваць творчую абстаноўку і магчымасці, што склаліся ў краіне пасля XXII з'езда КПСС, які стаў адпраўным пунктам, новым этапам у жыцці народа і знамянальнаю вехай у развіцці савецкага мастацтва.

— Пастанова ЦК КПСС «Аб мерах па паляпшэнню кіраўніцтва развіццём мастацкай кінематаграфіі» прымушае нас асабліва востра адчуць нашу адказнасць перад абавязкам выхоўваць працоўных у духу прынцыпаў маральнага кодэкса будаўнікоў камунізма, весці непрымірымую і вострую барацьбу супраць усяго, што перашкаджае інтарэсам Савецкай дзяржавы, нашага сацыялістычнага грамадства.

Гаворачы аб спрэчках, якія разгарнуліся на з'ездзе, М. Мінковіч адзначыў, што ўсе яны выкліканы шчырай заклапочанасцю дэлегатаў аб тым, каб беларуская кінематаграфія працавала лепш, каб яна выпускала творы, патрэбныя народу.

Прамоўца адзначыў пэўныя зрухі ў рабоце студыі «Беларусьфільм», якія абяцаюць прынесці плён у недалёкай будучыні. Актывізацыя творчых сувязей з пісьменнікамі — беларускімі і з іншых рэспублік — прыток новых, маладых сіл на студыю, рад арганізацыйных мерапрыемстваў,—усё гэта спрыяла ўстанаўленню сапраўды творчай атмасферы, якой жыве цяпер студыя.

— Аднак гэта зусім не дае падстаў для самазаспакоенасці, — папярэдзіў М. Мінковіч. — Нягледзячы на пэўны запас у рэпертуарным партфелі нельга лічыць, што на студыі поўнасцю вырашана сцэнарная праблема. Так, на 1964 год студыя пакуль што не мае ніводнага сцэнарыя, а трэба будзе паставіць восем фільмаў.

Прамоўца ўказвае на неабходнасць студыі мець дакладны тэматычны план работы над сцэнарыямі.

Сярод арганізацыйных пытанняў М. Мінковіч асабліва падкрэсліў неабходнасць сумеснай працы над фільмам аўтара, рэжысёра і рэдактара сцэнарыя. У якасці першага прыкладу ён адзначыў падрыхтоўку да запуску ў вытворчасць сцэнарыя аб жыцці і барацьбе слаўнай дачкі беларускага народа Веры Харужай.

М. Мінковіч падрабязна спыніўся на праблеме кінаакцёра. Ён адзначыў выпадкі, калі слабае артыстычнае выкананне, непрадуманае размеркаванне некаторых роляў зніжала мастацкія якасці фільмаў, выпускаемых нашай студыяй. Так было з карцінамі «Першыя выпрабаванні» і «Чалавек не здаецца». Прамоўца заклікаў рэжысёраў больш актыўна прыцягваць да ўдзелу ў нацыянальных фільмах беларускіх акцёраў. Ён выказаў думку аб неабходнасці павелічэння акцёрскай трупы студыі «Беларусьфільм».

М. Мінковіч звярнуў увагу на рэзкую крытыку ў дакладзе аргкамітэта работы Мінскай студыі навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў.

У рабоце студыі прамоўца лічыць найбольш нявырашанай сцэнарную праблему. Ён крытыкаваў думку, паводле якой дакументальнаму кіно быццам бы не патрэбен сцэнарый.

— На студыі вельмі абмежаваны аўтарскі актыў,—сцвярджае М. Мінковіч.—Не заўсёды на вышыні патрабавальнасці мастацкі савет студыі.

Ён прыводзіць нядаўні прыклад, калі кінастудыя, здаючы тры новыя фільмы, ацаніла ўсе іх па першай катэгорыі ў той час, як сапраўдныя мастацкія вартасці гэтых фільмаў не заслугоўвалі такой высокай ацэнкі.

Прамоўца выказаў думку аб неабходнасці стварэння на студыі вытворчага аддзела, які б займаўся работай здымачных груп.

— Усебаковае абмеркаванне спраў беларускай кінематаграфіі, якое адбылося на нашым з'ездзе, нараджае ўпэўненасць у тым, што мы здолеем пераадолець шматлікія перашкоды, якія сёння яшчэ існуюць, і будзем мець у бліжэйшы час новыя добрыя высокамастацкія кінатворы, — заключае М. А. Мінковіч.—Крытэрыем актуальнасці, надзённасці і баявітасці твораў кінамастацтва з'яўляецца велічны дакумент — Праграма Камуністычнай партыі Савецкага Саюза. У гэтым дакументе, маніфесце нашых дзён, вызначаны задачы народа ва ўсіх галінах гаспадарчай і культурнай дзейнасці.

Першы Устаноўчы з'езд Саюза кінематаграфістаў БССР праходзіў у абстаноўцы, калі партыя і ўрад ажыццявілі рад канкрэтных мерапрыемстваў, накіраваных на тое, каб на экраны выходзілі творы глыбока-ідэйныя, праўдзівыя, цікавыя, разнастайныя па жанрах, яркія па форме.

Выразная мова кінематографа, на якой мастак звяртаецца да мільёнаў гледачоў, павінна служыць стварэнню дасканалых па мастацкіх якасцях твораў, якія б клікалі да перамогі камунізма. Так выказаліся дэлегаты з'езда. Такі наказ яны далі будучаму кіраўніцтву саюза. З такім патрабаваннем ставяцца яны і да сябе, — да свайго жыцця ў мастацтве, да сваёй творчасці.

* * *

З'езд прыняў рэзалюцыю па справаздачнаму дакладу аргбюро Саюза кінематаграфістаў БССР.

Удзельнікі з'езда накіравалі пісьмо ЦК КПСС.

Выбрана праўленне Саюза работнікаў кінематаграфіі БССР, рэвізійная камісія і дэлегаты на першы з'езд кінематаграфістаў СССР. У склад праўлення саюза ўвайшлі: Ю. Альбіцкі, А. Булінскі, В. Вінаградаў, Л. Голуб, М. Гарбуноў, І. Дорскі, Ул. Корш-Саблін, А. Куляшоў, А. Красінскі, В. Смоляр, М. Фігуроўскі, Ул. Цяслюк, П. Шамшур; у склад рэвізійнай камісіі — Ул. Акуліч, Г. Удавенкаў і С. Рабінаў.

На пасяджэнні праўлення Саюза работнікаў кінематаграфіі БССР першым сакратаром праўлення выбран кінарэжысёр, народны артыст БССР Ул. Корш-Саблін, сакратарамі — М. Фігуроўскі і В. Смоляр.

ТРОХІ не ў фокусе...

Сяброўскія шаржы М. ЛІСОЎСКАГА.

Л. Голуб

Р. Гладунко

І. Шульман

М. Горцаў

М. Фрайман.

ТРОХІ не ў фокусе...

Сяброўскія шаржы М. ЛІСОЎСКАГА.

С. Герасімаў

М. Фігуроўскі

І. Вейняровіч

І. Дорскі

П. Васілеўскі

С. Фрыд

ЯШЧЭ АДЗІН НАРОДНЫ

Пастаноўкі драматычнага калектыву Маладзечанскай мэблевай фабрыкі карыстаюцца заслужанай папулярнасцю. Гэты калектыў заваяваў прызнанне ў працоўных раёна.

Сваё творчае жыццё гурток пачаў увосень 1957 года з падрыхтоўкі інтэрмедый, мастацкага чытання і аднаактовых спектакляў. Асабліва плённа калектыў пачаў працаваць з 1959 года. У ім ўдзельнічалі аматары драматычнага мастацтва майстар В. Паўлін, сталяры В. Агееў, Н. Яблонскі, фанероўшчыкі А. Булакова і Г. Агееў. Калектыў падрыхтаваў спектаклі «Збег акалічнасцей» і «Тры суботы». Абодва спектаклі былі паказаны на сцэнах клубаў многіх калгасаў і саўгасаў Маладзечанскага раёна.

Да 40-годдзя Ленінскага камсамола калектыў падрыхтаваў спектакль па п'есе Ц. Саладара «Адмагодкі навальніцы». У 1960 годзе гэты спектакль паспяхова прайшоў на рэспубліканскім конкурсе народных тэатраў і самадзейных тэатральных калектываў. Спектакль «Сержант міліцыі» па п'есе І. Лазуціна быў паказаны гледачам Мінска, Маладзечна, Смаргоні, на торфапрадпрыемствах «Чысць» і «Бярэзінскае».

На фестывалі «Тэатральная вясна» спектаклем «Мільён за ўсмешку» А. Сафронава драмкалектыў заняў першае месца сярод калектываў горада і раёна. Высокую ацэнку гледачоў атрымаў спектакль па п'есе І. Шамякіна «Не верце цішыні».

Толькі за апошнія два гады на прадпрыемствах горада Маладзечна, у калгасах і саўгасах раёна паказана 47 спектакляў, якія прагледзела каля 20 тысяч чалавек.

Нядаўна за дасягнутыя поспехі драматычнаму калектыву Маладзечанскай мэблевай фабрыкі пастановаю прэзідыума Беларускага савета прафсаюзаў прысвоена званне Народнага тэатра.

С. ЦЕРАХАЎ.

У КОЖНЫМ ДОМЕ—ЧЫТАЧ

Гомельская вуліца — на ўскраіне горада Добруша. І для жыхароў яе, каб далёка не хадзілі, створана грамадская бібліятэка. Кіраваць ёю ўзялася маладая работніца цэлюлозна-папяровага камбіната «Герой працы» камсамолка Марыя Дзегцярова.

Бібліятэка размясцілася ў доме М. Дзегцяровай. Вечарамі сюды заходзяць людзі па новыя кнігі. Старым кнігі прыносіць Марыя сама. Нярэдка яна чытае ім уголас. І людзі шчыра ўдзячны ёй.

На Калгаснай вуліцы — грамадскі бібліятэкар Эмілія Шабаліна. Яна працуе ў магазіне, дзе амаль штодзённа сустракаецца са сваімі чытачамі, і таму лепш ведае, што іх цікавіць.

Старанна працуюць і іншыя грамадскія бібліятэкары. Гэта — Васіль Шаблоўскі на вуліцы Тургенева, пенсіянерка Марыя Красільнікава, якая абслугоўвае жыхароў вуліц Першамайскай і Пляханава, Віктар Мажаеў на вуліцы Дзімітрава. Кнігамі, створаных на грамадскіх асновах бібліятэк, сёлета карысталася 620 чытачоў.

Ёсць грамадскія бібліятэкары і ў вёсках Добрушскага раёна. Мікалай Нявейкаў працуе кінамеханікам у вёсцы Барба. Тут ёсць і сельская бібліятэка. Але яна доўгі час была на замку, бо не было бібліятэкара. «А што калі мне ўзяцца за гэтую справу», — падумаў М. Нявейкаў. Прапанову яго падтрымалі ў раённым аддзеле культуры. І цяпер ён не толькі кінамеханік, але і грамадскі бібліятэкар.

А. КУРЛОВІЧ.

У ПАШАНЕ—ПОШУКІ

— У кабінеце дырэктара магілёўскага кінатэатра «Радзіма» заўсёды людна. Сюды прыходзяць настаўнікі, піянерважатыя, прафоргі.

— Хочам правесці збор на тэму «Артэк — мара піянерская». Дапамажыце, таварыш дырэктар, — просяць кіраўнікі дзіцячага клуба.

— У нас у школе створаны гурток «сяброў птушак». Ці можна сабраць у вас актывістаў, правесці заняткі і паказаць кінафільм? — пытае малады настаўнік заалогіі.

— Дзяўчаты нашы хочуць правесці дыспут па кінакарціне «Бітва ў дарозе». Ці нельга выкарыстаць малую залу кінатэатра?

Такія пытанні часта вырашае дырэктар кінатэатра І. Каламійчанка. Ён уважлівы да кожнай прапановы.

Цяжка сказаць, хто першым прапанаваў праводзіць сумесную масавую работу кінатэатра і абласной бібліятэкі імя Ул. І. Леніна. І гэтыя дружныя намаганні даюць добрыя вынікі. Дзве ўстановы культуры прыцягнулі вялізную аўдыторыю чытачоў і гледачоў.

Там, дзе ў пашане творчыя пошукі, дзе ёсць прастор свежым думкам, там новае стала ўваходзіць у жыццё.

Ул. БАГАЙЧУК.

НАРАДА РЭДАКТАРАЎ І РЭЦЭНЗЕНТАЎ

Такую нараду правяла днямі рэдакцыя мастацкай літаратуры Беларускага дзяржаўнага выдавецтва. Аб тым, як рэцэнзуюцца рукапісы, аб рабоце рэдактараў над творамі расказаў загадчык рэдакцыі А. Бажко.

Затым выступілі Р. Бярозкін, Я. Казека, М. Лужанін, А. Міронаў, З. Матузаў, В. Нікіфаровіч, Р. Ярохін. Яны гаварылі аб якасці рэцэнзій, адзначылі, што асобныя рэцэнзенты не заўсёды глыбока аналізуюць творы.

Удзельнікі нарады ўнеслі рад прапаноў, якія будуць садзейнічаць паляпшэнню работы пазаштатных рэцэнзентаў выдавецтва.

ЧАСОПІСЫ ў лістападзе

«МАЛАДОСЦЬ»

У адзінаццатай кніжцы часопіса друкуюцца вершы Міколы Кусянкова, апавяданні Паўла Кавалёва, Любаміра Смырчава, пачатак аповесці Алеся Пальчэўскага «Жнівеньская раніца», а тансама вершы Андрэя Малышкі ў перакладзе Аркадзя Куляшова — да 50-годдзя з дня нараджэння паэта.

Шырока адзначае часопіс васьмідзесяцігоддзе з дня нараджэння народнага паэта БССР Якуба Коласа. У нумары змешчаны артыкулы А. Мажэйкі, М. Жыгоцкага, нататкі С. Александровіча, А. Лойкі, Ю. Пшырнова, вершы Міколы Малаўкі і Генадзя Кляўко, прысвечаныя народнаму песняру.

Пад рубрыкай «На арбіту камунізма» друкуюцца нарысы С. Кухарава «Над Сожам», Р. Разінскага — «Выбух» і М. Тагушынскага — «Тут вяртаюць сумленне».

Раздзел «Навука і культура» прадстаўлены рэпартажамі А. Дзітлава і А. Сербантовіча, артыкуламі Б. Розена — «Таямніца бялка» і Д. Фактаровіча — «Цудоўны Лопе».

Змешчаны ў часопісе артыкул інструктара аддзела партыйных органаў ЦК КПБ С. Махавікова «На крылах ініцыятывы».

У раздзеле «Размова аб майстэрстве» з артыкулам «Крытыка і маладыя таленты» выступае А. Яскевіч.

Гумар і сатыра прадстаўлена ў нумары парадыйнай нізкай Ніла Гілевіча «Сучасныя замовы і заклёцці».

Вершы аб Радзіме. Выступае ўдзельніца агляду мастацкай самадзейнасці Мінскай вобласці піянерважатая Мар'інагорскай школы № 2 Людміла Барадзіна.
Фота Ул. КРУКА.

КНІГІ, ВЕРНУТЫЯ НАРОДУ

ДА 75-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ ЦІШКІ ГАРТНАГА

Здараюцца ў жыцці падзеі, якія з цягам часу набываюць асаблівы сэнс і значэнне.

... Тады быў я вучнем восьмага класа Капыльскай беларускай школы. Любіў кнігу і часта наведваўся ў школьную бібліятэку.

Аднойчы зайшоў у бібліятэку, а там нікога няма з вучняў. Сядзіць на каленцах сівы бібліятэкар і звязвае кнігі шпагатам.

— О, хлопча, добра што зайшоў! Ёсць справа да цябе, — сказаў мой колішні настаўнік, які цяпер быў бібліятэкарам і ведаў мяне як заядлага чытача. — На табе гэты пачак і схавай яго добра... Гэта, браце, кнігі Гартнага, Чарота, Зарэцкага, Баранавых і іншых пісьменнікаў. Ім няма ўжо месца на кніжнай паліцы... Калі праўда ёсць на свеце, — а я веру, яна ёсць! — то гэтыя кнігі яшчэ табе спатрэбяцца. Беражы іх! Некалі вернеш у бібліятэку і ўспамянеш маё слова...

Узяў я цяжкі пачак...

Гэтае здарэнне далёкіх юнацкіх год прыйшло мне на памяць, калі я сядзеў нядаўна ў Капыльскім Доме культуры на літаратурным вечары, прысвечаным памяці Ц. Гартнага, і слухаў выступленне В. Н. Чарнушэвіч. Настаўніца-пенсіянерка была суседжай Ц. Гартнага, у часе навучання ў Белпедтэхнікуме жыла на кватэры ў свайго земляка. Яна проста і шчыра, з вялікай душэўнай цеплынёю апавядала пра Цішку Гартнага — Пісьменніка і Чалавека...

Вядомы беларускі пісьменнік, грамадскі і культурны дзеяч Зміцер Жылуновіч — Цішка Гартны (1887 — 1937) прайшоў нялёгкі творчы і жыццёвы шлях. Ён усю энергію свайго няўрымслівага сэрца аддаў рэвалюцыйнай барацьбе, умацаванню заваёў Савецкай улады, развіццю беларускай нацыянальнай культуры.

Сын беззямельнага капыльскага селяніна, які працаваў грабаром на Палессі, сезонным рабочым у родным мястэчку, Ц. Гартны пайшоў бацькавай дарогай. Быў пастухом, чорнарабочым у гарбарнай майстэрні ў Капылі, а потым у пошуках працы абышоў Беларусь, Літву, Украіну і Латвію, нарэшце трапіў на пецярбургскі завод «Вулкан». У рабочым асяроддзі сталеў яго светапогляд.

Яшчэ хлапчуком, седзячы на пяньчуку з пугаю ў руках, ён зачытваўся творамі Някрасава. Потым прыйшлі ў Капыль творы Я. Купалы і Я. Коласа, якія адкрылі перад Ц. Гартным новыя паэтычныя далягляды, паказалі сілу і прыгажосць роднага беларускага слова.

У студзені 1909 г. з'явіўся ў «Нашай ніве» першы твор Ц. Гартнага, прысвечаны Я. Купалу. Потым верш пра Нёман («Эх, ты Нёман-рака, ці ты думаў, ці сніў, як слязу мужыка ў свае воды лавіў?»), які неўзабаве стаў народнай песняй і паплыў над беларускай зямлёй.

Дэмакратычная накіраванасць, палымяны пратэст супраць сацыяльнай несправядлівасці, глыбокі аптымізм і вера ў сілы народа, паэтызацыя чалавека працы, заклік да нацыянальна-вызваленчай барацьбы — усе гэтыя матывы зборніка вершаў Ц. Гартнага «Песні» (1913) збліжалі яго творчасць з паэзіяй Я. Купалы і Я. Коласа. Аднак трэба мець на ўвазе, што не ўсё сугучнае і блізкае ў творах Ц. Гартнага ішло непасрэдна ад паэзіі вялікіх беларускіх песняроў, многа было абумоўлена эпохай, грамадскім жыццём, калі абуджаны рэвалюцыяй 1905—1907 гг. народ уздымаўся на барацьбу за свае правы, за зямлю і волю.

Была ў вершах Ц. Гартнага і свая адметная рыса, якая выдзялялася на агульным фоне беларускай дарэвалюцыйнай паэзіі. У яго творах упершыню ў айчыннай літаратуры побач з вобразам «пана сахі і касы» паказаны вобраз рабочага —

«рыцара працы цяжкой», чалавека «з сэрцам палкім, як жар» («Песні гарбара», «Гарбар на вандроўцы» і інш). Пачынальнік беларускай рабочай паэзіі знайшоў дарогу не толькі ў «Нашу ніву», «Маладую Беларусь», але і на старонкі бальшавіцкага друку: некалькі яго вершаў было надрукавана ў 1912—1913 гг. у газетах «Звезда» і «Правда».

Літаратурная дзейнасць Ц. Гартнага была цесна звязана з грамадскім жыццём краіны, рэвалюцыйным рухам. Кастрычніцкую рэвалюцыю ён сустрэў з вялікай радасцю і надзвычайным творчым уздымам. Былы ўдзельнік Капыльскай арганізацыі РСДРП стаў членам Камуністычнай партыі, сакратаром беларускага нацыянальнага камісарыята пры ўрадзе РСФСР, рэдактарам першай савецкай беларускай газеты «Дзянніца».

Рукою Ц. Гартнага быў напісаны гістарычны дакумент, якім 1 студзеня 1919 года была абвешчана Савецкая Беларусь; ён узначаліў Рэвалюцыйны рабоча-сялянскі ўрад Беларусі. У цяжкія гады грамадзянскай вайны пісьменнік-камуніст знаходзіўся на паўднёвым фронце, працаваў у штабе 14 арміі, палітаддзеле Заходняга фронту. Здзіўляе аператыўнасць і вялікая творчая актыўнасць Ц. Гартнага: літаральна ў кожным нумары «Дзянніцы» і «Савецкай Беларусі» з'яўляюцца яго артыкулы і мастацкія творы розных жанраў. Ён выступаў як палымяны агітатар-публіцыст, шырока выкарыстоўваў выпрабаваную зброю сатыры, перадаваў рэвалюцыйны пафас народных мас, паказваў веліч сацыяльных перамен.

У гартнаўскіх зборніках «Песні працы і змагання» (1922) і «Ўрачыстасць» (1925) былі яшчэ паэтычныя выдаткі, пэўная даніна абстрактна-рамантычнаму ўспрыняццю падзей, але ў яго вершах адчуваўся і жывы подых бурлівых і грандыёзных дзён рэвалюцыі, героіка і небывалы энтузіязм тых людзей, што са зброяй у руках і непахіснай верай у перамогу ішлі адстойваць заваёвы Кастрычніка.

Яшчэ глыбей і шырэй адлюстравана рэвалюцыйная рэчаіснасць у прозе Ц. Гартнага. Багацце і навізна жыццёвага матэрыялу, суровы драматызм і героіка грамадзянскай вайны, стваральная праца новага чалавека, гартаванне і фарміраванне яго характару ў барацьбе за Савецкую ўладу — вось чым вызначаліся зборнікі апавяданняў «Трэскі на хвалях» (1924) і «Прысады» (1927).

Ц. Гартны-навеліст звяртаецца да малюнкаў дарэвалюцыйнага мінулага, паказвае вострыя сацыяльныя канфлікты («Лайдак», «Велікодная каробка»). Пісьменнік не абмяжоўваецца сялянскай тэматыкай, ён паказвае жыццё рабочага класа. Асаблівую цікавасць мае апавяданне «Штрэйкбрэхер», у якім раскрываецца складаны і супярэчлівы працэс абуджэння ў свядомасці рабочага Ануфрыя чалавечай годнасці.

Героі твораў Ц. Гартнага — гэта воіны Чырвонай Арміі, былыя франтавікі, якія вярнуліся на родныя папялішчы, незавыя савецкія работнікі, рабочыя, пасланыя на вёску разгортваць гаспадарчае будаўніцтва. Але ў цэнтры ўвагі заўсёды застаецца праблема фарміравання новага чалавека — радавога рэвалюцыйнай бітвы, вялікага пераўтваральніка грамадства («Чырвонаармеец Панкел Ліпа»), складаныя перыпетыі класавай барацьбы (апавяданне «Трэскі на хвалях»).

Наватарства Ц. Гартнага-празаіка праявілася не ў тым, што ён увёў прадстаўніка новага грамадскага ладу, а перш за ўсё ў тым, што паказаў багацце і веліч духоўнага свету савецкага чалавека. Вось начальнік раённай міліцыі Астап («Прысады»), у вобразе якога пісьменнік паказаў не проста чалавека, адданага свайму абавязку, а савецкага кіраўніка — гуманіста і рамантыка, які жыве марамі аб стваральнай працы. Фарміраванне новых адносін да працы паказана таксама ў апавяданнях «Свае блінцы», «Гаспадар», «Прыкры выпадак».

Цішка Гартны — аўтар вялікага эпічнага твора «Сокі цаліны», які быў храналагічна першым беларускім раманам (кніга «Бацькава воля» друкавалася ў скарочаным выглядзе ў 1916 г.). З твора аб жыцці ў глухім мястачковым закутку раман перарос у шырокае палатно, у якім адлюстравана нарастанне рэвалюцыйных сіл, паказана, як «з кожным часам новыя і новыя шэрагі заяк выступаюць на арэну змагання за вялікія ідэі вызвалення працоўных». Ц. Гартны ўвёў у беларускую прозу новага героя — прадстаўніка рабочага класа, прасачыў яго шляхі ў рэвалюцыю, разгарнуў малюнкі заводскіх будняў, мястачковага побыту, заанрануў многія праблемы грамадска-палітычнага жыцця Расіі.

Нягледзячы на пэўную ілюстрацыйнасць і статычнасць, вобраз галоўнага героя рамана «Сокі цаліны» Рыгора Нязвычнага быў значным дасягненнем маладой беларускай савецкай прозы на шляху стварэння вобраза рэвалюцыйнага пралетарыя. Рыгор — гэта валявая натура, арганізатар народных мас, чалавек, поўны бурлівай энергіі. Дзе б ён ні быў — сярод сілцоўскіх сяброў, рыжскіх ці пецярбургскіх рабочых, — непахісная вера ў перамогу народа не пакідае яго. Рыгор заўсёды ў самым віры падзей, там, дзе найбольш адказны і цяжкі ўчастак барацьбы. Набліжэнне грозных падзей прымушае яго задумвацца над чалавечым лёсам, глыбей адчуць людское гора, — усё гэта надае Рыгору новыя, больш простыя і жывыя рысы.

Значную цікавасць маюць і іншыя персанажы рамана. Многа сапраўднай прыгажосці ў вобліку Зосі, з вялікай цеплынёй створан вобраз маці Рыгора — Стэфы. Яркія і трапныя бытавыя дэталі знойдзены пісьменнікам для характарыстыкі мястачковых багацеяў Васіля і Хлора Берагаў.

Творчыя інтарэсы Ц. Гартнага былі вельмі шырокія і разнастайныя. Актыўна і плённа працаваў ён у галіне крытыкі і літаратуразнаўства, пісаў артыкулы пра творчасць Я. Купалы, М. Чарота, А. Гурло, а таксама пра надзённыя пытанні літаратурнага жыцця. Апрача артыкулаў і рэцэнзій на літаратурныя тэмы, Ц. Гартны выступаў у друку па пытаннях гісторыі рэвалюцыйнага руху на Беларусі, мовазнаўства, музыкі і тэатральнага мастацтва. Праўда, часам у палемічным запале ён выказваў спрэчныя думкі, як гэта здарылася ў часе тэатральнай дыскусіі (лістапад 1928). Але не гэта вызначала яго творчасць і вялікую арганізатарскую працу ў Дзяржвыдаце і Акадэміі навук БССР.

Многае зрабіў Ц. Гартны як рэдактар часопіса «Полымя» ў справе згуртавання пісьменніцкіх сіл і развіцця творчых сувязей беларускай літаратуры з літаратурамі братніх народаў СССР і прагрэсіўнымі пісьменнікамі замежных краін. Ён перакладаў творы А. Фадзеева на беларускую мову, пісаў артыкулы пра творчасць А. Пушкіна, А. Міцкевіча, Л. Талстога, В. Брусава, А. Блока, украінскага паэта В. Елана (Блакітнага) і інш. У часе падарожжаў за межы савецкай краіны Ц. Гартны наладжвае сяброўскія сувязі з Юліусам Фучыкам, Здэнекам Нядедлы, Іаганесам Бехерам, Францам Вейскопфам і іншымі, прыцягвае іх да супрацоўніцтва ў часопісе «Полымя».

Ц. Гартны знаходзіўся ў самым росквіце творчых сіл (закончыў раман «Перагуды», пачаў працу над раманам «Рассечаны вузел» з жыцця рабочага класа), калі ў гады культу асобы трагічна абарвалася яго жыццё. Актыўны прапагандыст пралетарскага інтэрнацыяналізму, пісьменнік, шчыра адданы Савецкай уладзе, быў абвінавачаны ў нацыяналізме... А ўся «віна» яго была ў тым, што ён моцна любіў беларускі народ, па-гаспадарску клапаціўся аб росквіце яго мовы, літаратуры і мастацтва...

...Старанна выконваў я наказ школьнага бібліятэкара і збіраў усе кнігі, якія мне былі калісьці даручана схаваць. Толькі, прызнаюся, што кнігі тыя не трапілі назад у школьную бібліятэку: іх прыйшлося раздаць самім аўтарам, якія вярнуліся на родную зямлю з далёкіх і цяжкіх дарог... А некалькі кніг і цяпер стаяць у мяне на кніжнай паліцы. Сярод іх зборнік «Трэскі на хвалях» выдання 1928 г., «Прысады» і «Гаспадар» з серыі «Мастацкае слова — масам», другі том твораў М. Чарота, зачытаны, з пашматанымі вокладкамі, раман М. Зарэцкага «Сцежкі-дарожкі». Гэтыя томікі, на вялікі, вялікі жаль, я не мог аддаць іх аўтарам...

Затое побач з гэтымі кнігамі-ветэранамі кнігамі нялёгкага лёсу паставіў я нядаўна новае выданне «Сокаў цаліны», «Сцежак-дарожак», двухтомнік М. Чарота.

Сцяпан АЛЕКСАНДРОВІЧ.

КОРАТКА

□ У гасцях у рабочых і інжынераў завода «Гомсельмаш» пабывалі артысты Гомельскага абласнога драматычнага тэатра. На сцэне заводскага Палаца культуры яны выступілі з паказам сваёй новай работы, спектакля «Ленінградскі праспект» па п'есе драматурга І. Штока.

В. СЯМЕНАЎ.

□ Калектыў сельскага кінастацыянара № 5. Верастовіцкага раёна (кінамеханік М. Радзевіч і яго памочнік А. Станкевіч) датэрмінова выканаў гадавы план па кінаабслугоўванню сельскага насельніцтва.

Рашэннем бюро райкома партыі і выканкома райсавета дэпутатаў працоўных калектыў сельскай кінаўстаноўкі занесены на раённую Дошку гонару.

В. КІСЛОЎ.

□ У Гомельскай абласной бібліятэцы ў дапамогу ўдзельнікам мастацкай самадзейнасці наладжана выстаўка «Насустрач Дэкадзе самадзейнага мастацтва», якая рэкамендуе разнастайную літаратуру — вершы Канстанцыі Буйла, байкі Уладзіміра Корбана, кніжкі «Беларускія народныя песні», «Танцы народаў СССР», аднаактовыя п'есы, рэпертуарныя лісткі рэспубліканскага і Гомельскага абласнога дамоў народнай творчасці.

В. СЯРГЕЕЎ.

□ У калгасе імя Тэльмана Брагінскага раёна пачала працаваць бібліятэка без бібліятэкара. Штодзённа калгаснікі прыходзяць сюды, выбіраюць кнігі і самі запісваюць іх у свае фармуляры. Усяго толькі два тыдні працуе бібліятэка, а ў ёй ужо 60 чытачоў.

Е. УМЕЦКАЯ.

□ «Кнігу — кожнаму працаўніку сяла!» — так называецца плакат, выпушчаны Віцебскім абласным упраўленнем культуры і абласной бібліятэкай імя Ул. І. Леніна.

Плакат расказвае аб вопыце работы ўстаноў культуры Гарадоцкага раёна. Плакат добра ілюстраваны, фатаграфіі расказваюць аб прапагандзе кнігі ў бібліятэках, на палявых станах, фермах.

М. РОЗУМ.

ЛІТАРАТУРА — ШКОЛА — ВЫХАВАННЕ

ДАЙЦЕ ЛОДАЧНІКУ ВЁСЛЫ!

Калі якая-небудзь сур'ёзная справа патрабуе неадкладнага паляпшэння, дык у народзе кажуць: «Дайце ў кола мазі». Такой справай з'яўляецца зараз выкладанне літаратуры, асабліва беларускай, у школах, яну і выхаванне літаратурнага густу ў нашай моладзі.

Як жа пратарыць шырэйшыя сцежкі да крыніцы душэўнага хараства — літаратуры?

Тут патрэбны ўсебаковыя, дзейсныя меры, а не разважанні і пажаданні, накшталт: «добра было б», «няхай бы», «малавата», «лепш і больш трэба» і г. д.

Патрабаванне Ул. Боганам і М. Гелерам, якія выступілі з артыкуламі ў «Літаратуры і мастацтве» *), эмацыянальнага аналізу мастацкага твора ў педагогіцы само сабой зразумелае. Але гэта не з'яўляецца рашаючым.

М. Гелер піша: «Як добра, калі настаўнік — самы гарачы прыхільнік пісьменніка, творчасць якога вывучаецца ў школе».

Для настаўніка гэта патрабаванне вельмі вузкае. Яму трэба быць самым гарачым прыхільнікам кожнага беларускага пісьменніка, творы якога вывучаюцца ці не вывучаюцца ў школе, бо творчасць кожнага з іх складае багацце нашай літаратуры.

Вялікая любоў настаўніка да літаратуры будзе выклікаць такую ж вялікую любоў і ў вучняў.

Далей М. Гелер піша: «Натхненне настаўніка — і чырвань на шчоках, і бляск вачэй, і яркія словы, і красамоўны ўзмах рукі — усё гэта ўражвае вучняў, прымушае часцей біцца сэрцы, глыбока хвалюе. А без такога хвалявання хіба можна па-сапраўднаму зразумець, адчуць літаратурны твор?»

Зразумела, нельга! Гэта правільна. І яркія словы, і красамоўны ўзмах рукі, і ўсе іншыя метадычныя прыёмы робяць урок жывым.

Але ж ці доўга можа палымнець гарачае слова настаўніка ў сэрцы вучня, калі ўрок беларускай літаратуры даецца толькі праз сем дзён? Якім бы яно гарачым ні было, дык за такі доўгі час, як метал, астыне. У месяц чатыры ўрокі?! Хіба можна чаго-небудзь значнага тут дабіцца?

Эмоцыі — гэта фарбы ўрока, а ці шмат створыш фарбамі, калі няма палатна, няма на чым маляваць!

Адсюль вывад: не пашкадуем для літаратуры хоць бы адной праграмнай гадзіны. Узяць яе можна з трох гадзін працоўнага навучання. Двух гадзін для працоўнага навучання дастаткова. Чаму? Па-першае, яшчэ майстэрні слаба абсталяваны, не хапае матэрыялу, няма спецыялістаў. Па-другое, тры гадзіны працоўнага навучання вельмі нязручна размяжоўваюцца. Глядзіце: працоўнае навучанне — раз у тыдзень, тры гадзіны запар. Дзве гадзіны спачатку хлопчыкі займаюцца ў майстэрні, а ў гэты час дзяўчынкі займаюцца па дамаводству (1 гадзіна) і па сельскай гаспадарцы (1 гадзіна), а пасля адну гадзіну займаюцца ў майстэрні, а хлопчыкі ў сельскай гаспадарцы (1 гадзіна). Працай заняты тры настаўнікі. Даволі складаная сетка. Трэба скараціць праграму па дамаводству да мінімума. І атрымаецца: у майстэрні 1 гадзіну займаюцца хлопчыкі, а ў гэты час дзяўчынкі па дамаводству, або ў сельскай гаспадарцы, а на другую гадзіну наадварот.

Дадатковая гадзіна ў тыдзень па літаратуры дасць адчувальны эфект.

Тады сапраўды пачнуць часцей біцца сэрцы вучняў. І асабліва тады, калі настаўнік не толькі на ўроку будзе майстрам прыгожага слова, але і пасля ўроку будзе размаўляць такой жа самай прыгожай мовай.

Маючы столькі гадзін, можна аднавіць занядбаную форму навучання — самастойныя сачыненні вучняў. На сучасным этапе развіцця школы ўсякія творчыя работы вучняў, у тым ліку і сачыненні, трэба ўзняць на шчыт. Чаму?

Увесь працэс выхавання і навучання ў школе зводзіцца да сутнасці да наступных задач: па-першае, вучань павінен быць эмацыянальна граматным, па-другое, павінен мець строга акрэсленае сістэматычнае кола ведаў, па-трэцяе, павінен умець вусна і пісьмова выкладаць свае думкі, пазнанні і даследаванні.

Нашы школы павінны рыхтаваць высокапісьменнага чалавека касмічна-атамнай эры, чалавека-тварца.

Сачыненні вучняў і ёсць тыя каштоўныя практыкаванні, што развіваюць творчае мысленне, і да іх трэба клапатліва адносіцца...

Не даць творчага мыслення вучню ўсё роўна, што лодачніку не даць вёсел у далёкае плаванне.

Мы, напрыклад, сачыненні вучняў па літаратуры і гісторыі змяшчаем у асобныя альбомы. Атрымоўваецца цікавы рукапісны альманах. Вучні вельмі ахвотна самі робяць загалоўкі каляровымі алоўкамі, перапісваюць матэрыялы і ўмела падбіраюць ілюстрацыі да іх. Яны бачаць, як нараджаецца жывая кніга.

Вельмі цікавымі, не горш, чым па літаратуры, атрымоўваюцца сачыненні-апавяданні па гісторыі. Напрыклад: «У пячоры першабытнага чалавека», «Першая лодка першабытнага чалавека» і г. д. Творчыя работы заўсёды выклікаюць зацікаўленасць вучняў, асабліва, калі відаць вынікі.

А самымі радаснымі вынікамі павінны быць экзамены. Экзамены ў васьмігадовай школе лепш усяго праводзіць праз два гады: у шостым і восьмым класе.

Вялікія змены трэба ўнесці ў праграмы філалагічных факультэтаў.

Па беларускай літаратуры, а таксама і рускай, неабходна адвесці значную колькасць гадзін на завучванне вершаў, урыўкаў з паэм, апавяданняў і г. д. Мы нядаўна закончылі інстытут і неабходнасць гэтага ў працы адчулі на сабе. За ўсе пяць гадоў навучання ў інстытуце з нас патрабавалі ведаць напамяць толькі «Песню аб сокале» і то не па праграме літаратуры, а па выразнаму чытанню. І вось зараз, працуючы ў школе, прыходзіцца даганяць упушчанае, бо сам настаўнік павінен першым прыгожа прачытаць верш, а пасля ўжо патрабаваць ад вучняў.

Між іншым, і ў школе на завучванне напамяць адводзіцца зусім мала часу. З усіх 54 гадзін у 5—7 кл. па беларускай літаратуры на завучванне напамяць адводзіцца ўсяго 6 гадзін, у 8 класе з 52 толькі пяць.

Вельмі мала мы выконваем пісьмовых работ па беларускай мове ў інстытуце. Пісалі пераважна дыктоўкі, а пра сачыненні і гутаркі не было.

Нам здаецца, што кожны студэнт-філолаг павінен спрабаваць свае сілы ў творчых пісьмовых работах (пісаць вершы, апавяданні, рэцэнзіі і інш.), а на практычных заняткі (для гэтага павінен быць адведзен час!) прааналізаваць іх. Спачатку няхай выступіць аўтар, потым рэцэнзент, а за ім — студэнты, а выкладчык падагуліць дыскусію.

У гэтым выпадку кожны выказаў бы сваю думку і паглядзеў бы, як яна стасуецца да меркаванняў усёй групы студэнтаў.

А каб студэнты былі падрыхтаваны ўжо да гэтага, дык трэба яшчэ ў школе рыхтаваць іх: адкрываць іх душы, адшукваць аднолькавыя схільнасці, аб'ядноўваць па будучай прафесіі.

Напрыклад, у нашай школе той, хто цікавіцца літаратурай, — займаецца ў фальклорным гуртку: перапісвае песні, казкі і іншую народную творчасць. Юныя гісторыкі вядуць заняткі ў малодшых класах, займаюцца археалагічнымі раскопкамі, складаюць летапіс калгаса, ствараюць школьны гісторыка-краязнаўчы музей.

Вось так па крупіцах мы стараемся выкарыстаць усё магчымае, каб прывіць вучням любоў і цікавасць да літаратуры, абудзіць іх творчае мысленне. А для таго, каб гэтыя імкненні заўсёды прыносілі плён, варта яшчэ многа зрабіць, у тым ліку ўлічыць усе слушныя заўвагі і прапановы, якія выказаны чытачамі газеты «Літаратура і мастацтва» ў артыкулах, прысвечаных абмеркаванню пытанняў выкладання літаратуры ў школе.

Ул. ПЕРНІКАЎ,
В. ГУСЦІНОВІЧ,
настаўнік Асіпаўскай школы.
Віцебскі раён.

ПАПРОК І Ў АДРАС МІНІСТЭРСТВА

Мне даводзілася прысутнічаць на ўроках літаратуры ў сваёй школе і ў некаторых іншых школах раёна. І мала калі ўрокі літаратуры прыносілі асалоду. Чаму так? Прыходзілася разважаць, аналізаваць... Што ж атрымліваецца? Атрымліваецца тое, што мы, многія выкладчыкі літаратуры, падмяняем вывучэнне літаратуры на ўроках вывучэннем гісторыі. Да чаго зводзіцца, напрыклад, вывучэнне апавядання Якуба Коласа «Васіль Чурыла»? Настаўнік патрабуе пераказаць змест апавядання, ахарактарызаваць жыццё сялян да Кастрычніцкай рэвалюцыі, глыбока раскрыць адносіны паноў да сялян. На гэтым вывучэнне апавядання і канчаецца.

Вядома, вывучэнне літаратуры цесна звязана з вывучэннем гісторыі. Але мы, літаратары, павінны помніць, што «пісьменнік — інжынер чалавечых душ» і на першым плане павінен стаяць чалавек. Па-другое, мы не павінны забываць, што літаратура ўздзейнічае на чалавека праз пачуцці.

Хочацца зазначыць і пра культуру мовы настаўніка. Не кожны яшчэ мае яе. Добра было б, каб у вну, як прапануе Ул. Боган («Літаратура і мастацтва» ад 18 верасня), увялі важны і неабходны для філолага прадмет — практычную стылістыку вуснай і пісьмовай мовы. Гэта пайшло б толькі на карысць агульнай справе.

Кафедрам літаратуры інстытутаў таксама неабходна паклапаціцца, каб курсавыя работы студэнтам падбіраліся больш цікавыя і жывыя. Чаго, напрыклад, варта курсавая работа па літаратуры на такую тэму: «Калектывізацыя ў паэзіі Янкі Купалы». Будучаму настаўніку такая работа ніякай карысці, вядома, не дасць.

Але ніяк нельга згадзіцца з выказваннем Ул. Богана пра гістарычную граматыку. Аўтар відаць, сам не ведае вучэбнага плана, калі зазначае, што на вывучэнне гістарычнай граматыкі адводзіцца шмат часу. На вывучэнне гістарычнай граматыкі адводзіцца толькі 51 гадзіна — гэта сотая частка ўсіх вучэбных гадзін. Гістарычная граматыка — карысны і неабходны прадмет для філолага, адмовіцца ад яе — тое ж самае, што адмовіцца матэматыку ад вышэйшай матэматыкі. Вядома, знойдуцца студэнты, што падтрымаюць прапанову Ул. Богана. Але, здаецца, не трэба браць арыенцір на такіх студэнтаў.

Хочацца зрабіць папрок і Міністэрству асветы. Настаў час стварыць добрыя падручнікі. Амаль усе заданні, што даюцца пасля вывучэння таго ці іншага твора, не развіваюць самастойнай думкі вучняў. І большасць падручнікаў для школы напісаны цяжкай, незразумелай мовай. Асабліва нізкая культура мовы вучэбных праграм, розных загадаў.

Пара падумаць Міністэрству асветы і пра тыраж выдання дапаможнікаў для настаўнікаў. Выйшла, напрыклад, добрая кніжка Ф. Янкоўскага «Пытанні культуры мовы». А ці мае яе настаўнік-філолаг? Не мае. Тыраж яе (1.350 экземпляраў) не задаволіў патрэб і сотай часткі настаўнікаў. А гэтая кніжка патрэбна не толькі настаўніку.

В. РАБКЕВІЧ,
настаўнік Бародзіцкай школы.
Браслаўскі раён.

* 18 верасня і 5 кастрычніка г. г.

ПЕРШЫ СНЕГ. Фотаэцюд М. МОНІЧА.

ХІРУРГІ ЗЯМЛІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

плуг — не зусім зручная прылада. Ён не толькі не забяспечвае поўнай механізацыі работ. Ён вываротвае ў ворыўны гарызонт неўрадлівы пясок, а гумусавы верхні пласт цалкам трапляе ўніз. Яшчэ больш прымітыўна ажыццяўляецца пластавае ўнясенне ўгнаенняў у Кітаі.

Агратэхніка патрабавала стварыць такую машыну, якая б не абарочвала пласт, а толькі ўзрыхляла яго. Беларускія вучоныя задумаліся — які ж рабочы орган прыняць за аснову? Ад плуга, які пераварочвае пласт, адразу ж адмовіліся.

Вагін разам са сваімі супрацоўнікамі пачаў вывучаць усе рабочыя органы, якія ўзнімалі пласт, не пераварочваючы яго. І ў 1959 годзе з'явілася першая эксперыментальная машына, рабочым органам якой быў прамы клін з бакавымі шчокамі. Яна дала нядрэнныя вынікі. Аднак патрабавалася вельмі вялікая цяглавая сіла. Патрэбны былі магутныя трактары, якіх у гаспадарках не так многа. Апроч таго, клін заворваў угнаенні толькі на 30 сантыметраў. А гэтага недастаткова.

Вучоныя зноў задумаліся: як зменшыць цяглавае супраціўленне, зрабіць больш таннай самую ўстаноўку, як палепшыць яе паказчыкі ў працы? Праз год стварылі яшчэ адзін эксперыментальны ўзор машыны з аднабаковым касым клінам. Для работы з новай прыладай патрабавалася менш цягла, але ў той жа час абцяжарвалася падача пад яго ўгнаенняў. Узнікла неабходнасць устанавіць дадатковы рабочы орган.

Другі варыянт машыны быў лепшы за першы, але і ён не задавальняў вынаходцаў. І пошукі працягваліся. Ля чарцёжнай дошкі і за рабочым сталом, у лабараторыях і ў майстэрнях завода.

Не мог дакладна прыпомніць Анатоль Цімафеевіч, калі менавіта ўзнікла ідэя выкарыстаць двухбаковы касы клін. Магчыма, яна прыйшла ў адну з бяссонных начэй, а магчыма, гэта быў лагічны вынік незлічоных эксперыментаў і даследаванняў.

Зноў і зноў паглыбляюцца вынаходнікі ў тайны глебазнаўства, яшчэ і яшчэ раз правяраюць усе разлікі і дэталі. Двухбаковы касы клін — гэта яшчэ не рабочы орган машыны. Неабходна знайсці найлепшыя параметры, найбольш дасканалае канструктыўнае і тэхнічнае вырашэнне. І галоўнае — ён, вядома, павінен працаваць, ды так, як патрабуе навука, каб тэорыя стала рэальнасцю, каб тысячы і тысячы гектараў неўрадлівай зямлі давалі багатыя ўраджаі.

У той дзень, калі новы агрэгат упершыню вывезлі ў поле, Анатоль Цімафеевіч амаль не хваляваўся. Ён ведаў, што калі ёсць якая-небудзь недакладнасць у разліках, калі і зараз пасля шматгадовых пошукаў будзе няўдача, — ён усё роўна будзе працягваць работу да таго часу, пакуль не зробіць тое, што трэба.

Той першы дзень застаўся далёка ззаду. Машына выдатна працуе ўжо некалькі месяцаў...

... Калі хто-небудзь хоць адзін раз быў на полі, дзе адначасова знаходзіцца вялікая колькасць новых сельскагаспадарчых машын, той зразумее маё пачуццё захаплення і вялікага гонару за справы рук чалавечых. Не як перад парадам, а як перад рашучай працоўнай бітвай выстраіліся на полі ажурныя сеялкі для падглебавай сяўбы, магутныя скарасныя плугі, самыя новыя машыны для ўнясення ўгнаенняў, гідрабуры для высадкі расады і дзесяткі іншых машын, магчыма ўжо вядомых раней, але з новымі якасцямі. Першым у радзе стаяў невялікі агрэгат. Трактар, кузаў з арганічнымі ўгнаеннямі і дзіўны рабочы орган, падобны на апушчаную руку, якая трымае штосьці важкае і карыснае.

— Расказваў я вам сёння многа, а цяпер, глядзіце. — Вагін падышоў да трактарыста і праз некалькі мінут агрэгат ажыў і рушыў па полі. Клін плаўна заглыбіўся на 60 сантыметраў, і на паверхні глебы засталася ледзь прыкметная ўзрыхленая паласа.

Мы ледзь паспявалі за агрэгатам. З кузава па прадоўжным і папярэчным транспарцёры, як па жылах, угнаенні пайшлі ў канал рабочага органа, які накіраваў іх у прастору пад клінам.

— Пад клінам, які мае шырыню захопу адзін метр, устаноўлен дыск, які верціцца, — растлумачыў Вагін. — Гэты дыск забяспечвае раўнамернае размеркаванне угнаенняў. Дазіроўка іх ажыццяўляецца з дапамогаю транспарцёраў. Усе механізмы прыводзяцца ў рух ад вала адбору магутнасці трактара. Прадукцыйнасць агрэгата за змену два-тры гектары. Нормы ўнясення могуць мяняцца ў межах ад 30 да 200 тон на гектар. Цяпер, як вы бачыце, агрэгат уносіць торфакрошку. Таксама добра ён працуе з гноем, торфагноевымі кампостамі і іншымі відамі арганічных угнаенняў. Агрэгатавацца можа з трактарамі Т-75, Т-74, а ў цяжкіх умовах — пры няроўным гарыстым рэльефе — з трактарамі С-80 і С-100.

Трактар дайшоў да берагу поля і плаўна развярнуўся. Нібы не затрачваючы ніякіх намаганняў, рабочы орган лёгка паглыбіўся і зноў, як вялізны шпрыц, што нясе ў хворы арганізм соні ажыўлення, паглыбіўся ў глебу на 30 сантыметраў. Адзін праход, другі, трэці. Калі б зараз разрэзаць участак, дык ён здаўся б слаёным пірагом вялізных памераў і незвычайных уласцівасцей.

Анатоль Цімафеевіч акінуў машыну клапатлівым позіркам і задаволена ўсміхнуўся:

— Шкада, што не бачыць наш агрэгат венгерскі вучоны Шандар Эгерсегі. Дарэчы, ён вельмі ўважліва сочыць за нашай работай. Зусім нядаўна атрымалі ад яго пісьмо. Вось што ён піша. — Вагін дастаў з кішэні акуратна складзенае пісьмо, зрабіў знак трактарысту спыніць агрэгат і пачаў чытаць: — «Многапаважаны таварыш Вагін! Дазвольце пацікавіцца далейшым лёсам агрэгата вашай канструкцыі. Ці будзе выпушчана сёлета 1 500 штук, як планавалася? Мяне вельмі цікавяць вынікі вашых работ. Дазвольце пажадаць Вам многіх поспехаў ад майго імя і ад імя маіх супрацоўнікаў. Шандар Эгерсегі».

— Мы і самі марым хутчэй убачыць тысячы нашых агрэгатаў на калгасных палях. Убачыць сцяною збажыну там, дзе праходзілі нашы машыны. А цяпер, калі вы ўжо аб усім даведаліся і ўбачылі, — мяркуйце самі, ці далёка ад гэтай мары да сапраўднасці...

Р. БАРАВІКОВА.

ЧАСОПІСЫ у літаратуры

«БЕЛАРУСЬ»

Лістападаўскі нумар часопіса адкрываецца вершамі Паўлюка Пранузы і Сяргея Дзяргая. Апублікаваны таксама вершы Ніла Гілевіча, Адама Русака, і Пятра Прыходзькі, апавяданні Паўла Кавалёва, Кастуся Кірэенкі, Міхася Гарбачова і працяг аповесці Міколы Ваданосава «Растрывожаны лес».

Да 80-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа часопіс змяшчае артыкул В. Рагойшы «Якуб Колас — пераканаўчы», артыкул І. Баса «Першыя водгукі» і допіс Д. Родзіна «У гасцях у герояў трылогіі Якуба Коласа «На ростанях».

Надрукавана рэцэнзія Ул. Бойкі на кнігу Міхася Машары «Мая зёрная краіна». У раздзеле «Новыя кнігі» змешчаны кароткія рэцэнзіі М. Базарэвіча на кніжку-казку Якуба Коласа «Дзіва», што выйшла сёлета на рускай мове, Б. Бур'яна на зборнік апавяданняў Міхася Стральцова «Блакітны вецер» і А. Сідарэнкі на кніжку «Полацк», што выйшла ў выдавецтве АН БССР.

Многа ў часопісе публіцыстычных матэрыялаў, прысвечаных розным пытанням гаспадарчага і культурнага жыцця нашай рэспублікі. Змешчана інтэрвію з першым сакратаром Гомельскага абкома КПБ І. Я. Паляковым, рэпартаж Ул. Дадзіёмава з Бярозаўскай ДРЭС, расказ старога рабочага Магілёўскага гарбарнага завода Д. Л. Калеснікава, нарыс М. Савіча «Чырвоны вымпел» — аб бялыніцкіх Ільнаводах, нарыс Ф. Собаля «Сям'я» — аб сям'і настаўніцы 41-ай школы горада Мінска М. П. Зубковай, фотанарыс І. Красуцкага аб справах юных лесаводаў з Каравацінай школы Гомельскай вобласці.

Акрамя гэтага ў часопісе надрукаваны рад іншых разнастайных матэрыялаў.



У Мінску пачаў гастролі літоўскі цырк «Вільнюс».

На здымку: выступаюць артысты А. Гінейка і Д. Берайшэне.

Фота Ул. КРУКА.

Т. ДУБКОВА, Г. ВАГНЕР.

ДНІ чэхаславацкай культуры

З «ПРАЖСКАЙ ВЯСНЫ»

Семнаццаты фестываль «Пражская вясна», на якім мы прысутнічалі, праходзіў у маі — чэрвені сёлетняга года. Гэта буйнейшае міжнароднае музычнае свята з'яўляецца аглядам лепшых твораў, творчых калектываў і асобных выканаўцаў сезона (фестываль праводзіцца штогод). Па традыцыі ён адкрываецца выкананнем сімфанічнага цыкла Сметаны «Мая радзіма», а на закрыцці іграецца Дзевятая сімфонія Бетховена.

Сёлета ў канцэртах фестывалю прымалі ўдзел аркестры Чэшскай філармоніі, Чэхаславацкага радыё, гарадоў Прагі (ФОК), Астравы і Брно і Венгерскі дзяржаўны сімфанічны аркестр. Выканаўчая культура гэтых калектываў настолькі высокая, што цяжка аддаць перавагу якомусьці аднаму з іх.

Аматараў акадэмічнай манеры выканання здзівіць строгасць і віртуознасць ігры аркестра Чэшскай філармоніі, які ўзначальвае Я. Кромбгольц.

Выключная чуласць Пражскага гарадскога аркестра ФОК як да найцяжэйшых твораў сучаснай музыкі, так і да манеры і творчага аблічча дырыжора, стварылі ўражанне універсальнасці гэтага музычнага калектыву. Прыхільнікаў напружанай экспрэсіўнасці выканання, безумоўна, прыцягнулі б канцэрты Венгерскага сімфанічнага аркестра (дырыжор Я. Ферэнчык), у рэпертуар якога ўвайшлі сімфонія Кадаі, «Мора» Дэбюсі, «Док Жуан» Р. Штрауса, віяланчэльны канцэрт А. Міхая. Гучанню гэтага аркестра ўласцівая характэрная афарбоўка (галоўным чынам за лік струнных інструментаў), дзякуючы якой яго можна пазнаць сярод многіх іншых.

Кожны з запрошаных на фестываль дырыжораў мог сам выбіраць аркестр для свайго выступлення. Так, Джорджэ Джарджэску выбраў аркестр горада Брно, ім жа выпаў гонар выканаць у заключным канцэрце ў саборы св. Віта Дзевятую сімфонію Бетховена. Лорын Мазел (ЗША) і Франко Карачыола (Італія), дырыжыравалі аркестрам Чэшскай філармоніі, Чарлз Макерас (Англія) і Жан Марцінон (Францыя) — аркестрам Радыё, Караль Стрыя (Польшча) і Зубін Мехта (Індыя) — аркестрам ФОК.

Дж. Джарджэску належыць да буйнейшых дырыжораў свету, і мы вырашылі ахвяраваць адзін камерны канцэрт, каб трапіць на рэпетыцыю да румынскага музыканта і паглядзець, як ён працуе з аркестрам. Калі мы сказалі пра свой намер чэшскім таварышам, яны чамусьці збянтэжана ўсміхнуліся і пачалі ўгаворваць не ісці на рэпетыцыю. А чаму — нам ніхто адразу не сказаў. Як высветлілася ўжо потым, Джарджэску лічыцца сярод музыкантаў чалавекам суровым, запальчывым і рэзкім, ён амаль ніколі не дазваляе пабочным прысутнічаць на сваіх рэпетыцыях. І вось румынскі кампазітар пачуў нашу просьбу пабываць у яго на рэпетыцыйных занятках. Ён спярша нібы здзівіўся, а потымветліва ўсміхнуўся і папрасіў свайго асістэнта правесці нас у залу. Работа Джарджэску з аркестрам, на наш погляд, магла б быць выдатным урокам для музыкантаў і дырыжораў самай высокай кваліфікацыі. За тры гадзіны яго рэпетыцыі мы пазналі і ўбачылі больш, чым з добрай кнігі аб дырыжорскім мастацтве.

Маладое пакаленне дырыжораў не фестывалі прадстаўлялі Лорын Мазел і Зубін Мехта. Невядома, як складзецца іх далейшы творчы лёс, але абодва яны ўжо зараз (кожнаму з іх каля трыццаці гадоў) — выдатныя музыканты. Яны дасканала валодаюць дырыжорскай тэхнікай, маюць тонкі слых і фенаменальную памяць. Мазел тэмпераментны, яркі і няроўны. У яго інтэрпрэтацыі «Жар-птушка» Стравінскага і Сёмая сімфонія Сібеліуса пакінулі незабыўнае ўражанне. Трактоўка ж гэтым музыкантам Пятай сімфоніі Бетховена, якая літаральна навязваецца слухачам сілаю дырыжорскага таленту, выклікае некаторае пярэчанне. Мехта больш стрыманы і сціплы. Але як глыбока і сур'ёзна раскрыў ён вобразы Другой сімфоніі Анегера і Трэцяй сімфоніі Стравінскага!

Вельмі шматпланава былі прадстаўлены ў канцэртах «Пражскай вясны» і салісты.

У Чэхаславакіі, калі можна так сказаць, існуе культ камернай музыкі. У кожнай невялічкай вёсачцы ёсць свой камерны ансамбль аматараў. Відаць, таму камерная музыка як класічная, так і сучасная, была так шырока прадстаўлена ў канцэртах «Пражскай вясны». І хоць мы ўжо паспелі прывыкнуць да тэхнічнай бездакорнасці выканання фестывальных праграм, нас аднак здзівіла майстэрства чэшскага трыо Сука, чэшскага квартэта імя Яначака, а таксама італьянскага трыо д'Аркі і французскага квартэта Ловенгут.

Значнае месца ў фестывальных праграмах займалі наша музыка і нашы выканаўцы. У канцэртах з вялікім поспехам былі сыграны Чацвёртая і Дванаццатая сімфоніі Д. Шастаковіча, «Скіфская сюіта» і Класічная сімфонія С. Пракоф'ева, Канцэрт для фартэпіяна з аркестрам Г. Галыніка і іншыя творы. Савецкае дырыжорскае майстэрства прадстаўляў малады дырыжор Г. Раждзественскі, а выканаўчае — І. Бязродны, Б. Давідовіч, Г. Отс, Я. Фліер. Нашы музыканты карысталіся ў патрабавальных чэшскіх слухачоў, якія добра ведаюць лепшых выканаўцаў свету, вялікай папулярнасцю.

У якой ступені была прадстаўлена на фестывалі сучасная музыка? Вядома, вельмі цяжка ў канцэртах «Пражскай вясны» адлюстраваць многія напрамкі сучаснай музычнай творчасці. Ды гэты фестываль і не ставіць перад сабою такой мэты: бо ён не з'яўляецца фестывалем сучаснай музыкі, як, напрыклад, «Варшаўская восень». На «Пражскую вясну» адбіраюцца толькі найбольш цікавыя сучасныя творы, якія раней ужо прагучалі з эстрады і атрымалі ацэнку грамадскасці.

І ўсё ж параўноўваючы паміж сабою праграмы трох апошніх пражскіх фестываляў, можна бачыць, як стала значна больш выконвацца на іх твораў кампазітараў сённяшніх дзён. Гэта адна асаблівасць, другая — гэта жаданне арганізатараў фестывалю паказаць тое лепшае, што адбылося ў музычным свеце за апошнія год-два. І часта нашы чэхаславацкія сябры робяць гэта за лік твораў сваіх кампазітараў.

Сёння ў Чэхаславакіі налічваецца каля 250 кампазітараў. З некаторымі з іх мы пазнаёміліся на творчых сустрэчах у Празе і Брно. Нас асабліва цікавіла творчасць маладых аўтараў. Таму ўвесь вольны ад фестывальных канцэртаў час мы аддавалі праслухоўванню іх твораў. Большасць чэхаславацкіх маладых кампазітараў піша свежа, рэалістычна. Яны праяўляюць вялікую цікавасць да музычнага фальклору, імкнуцца асэнсаваць і абагуліць яго заканамернасці і асаблівасці, знайсці шляхі іх пераўтварэння сучаснымі сродкамі выразнасці. Гэтыя ж імкненні характэрныя і для беларускіх кампазітараў. Толькі чэшскія таварышы, магчыма, крыху смялейшыя ў сваіх пошуках і, як нам здалося, больш прадукцыйныя ў творчасці.

На гэтым міжнародным фестывалі выступалі два пражскія тэатры — Нацыянальны і Тэатр імя Сметаны, Славацкі тэатр і праслаўленая берлінская Камічная опера. Гэты апошні музычны калектыў асабліва захапіў усіх удзельнікаў фестывалю сваёй высокай вакальнай культурай выканаўцаў, дасканаласцю акцёрскага майстэрства, выключна цікавай рэжысёрскай работай Вальтэра Фельзенштэйна. Амаль кожная прэм'ера Камічнай оперы становіцца падзеяй сусветнага значэння. Усё ў спектаклях В. Фельзенштэйна адточана. Выдатны малюнак масавых сцэн, яркае і выразнае спяванне салістаў, адмаўленне ад шаблонных оперных прыёмаў — гэта толькі дэталі, якія дазваляюць выдатнаму рэжысёру рэалізаваць у оперным тэатры свой прынцып — «жыццёвая праўда і яснасць». Патрабаванне жыцця ў вобразе, адзінства пачуццяў акцёра і гледача збліжае тэатр В. Фельзенштэйна з тэатрам Бертольда Брэхта. «Ужо дзесяць гадоў, — гаворыць В. Фельзенштэйн, — я працую ў гэтым тэатры. Рэжысёрскія трукі мяне больш не цікавяць. Я не хачу быць рэжысёрам у звычайным разуменні. Я хачу раскрываць музыку, хачу прабаваць, эксперыментаваць, каб убачыць, у якой меры магчыма сапраўднае, паслядоўнае выкананне музыкі на сцэне».

Мы не можам тут яшчэ не расказаць пра чэшскі тэатр музыкі. Ці чулі вы пра яго калі-небудзь?

Уявіце сабе невялікае, выдатна акустычна абсталяванае памяшканне на 134 месцы, са зручнымі, свабодна размешчанымі, мяккімі крэсламі і шматканальнай стэрэафанічнай рэпрадукцыяй запісаў. У фанатэцы тэатра музыкі, якая налічвае каля 33 тысяч пласцінак і 80 тысяч магнітафонных ролікаў, ёсць практычна ўсё хоць раз выкананае.

Іншы раз на экране сцэны дэманструюцца кінакадры ці дыяпазітывы, іншы раз выступаюць жывыя выканаўцы. Пры ўзнаўленні гуказапісу шырока прымяняюцца светлавыя эфекты. Музычныя праграмы змяняюцца па прынцыпу сеансаў у звычайных кінатэатрах. Але вы можаце зайсці і паглядзець дзве ці тры праграмы, колькі захочаце. Тыпы праграм розныя і разлічаны на самыя разнастайныя густы і ўзровень музычнай падрыхтоўкі слухачоў — праграмы з тлумачальным словам і проста канцэрт. Вы можаце праслухаць літаратурна-музычны мантаж, лекцыю па гісторыі музыкі і канцэрт джазавай музыкі, пазнаёміцца з сучаснымі чэшскімі і зарубежнымі кампазітарамі і выканаўцамі і г. д.

Тэатр музыкі існуе з 1949 года. Да гэтага часу яго наведала звыш мільёна слухачоў. Гэта пераканаўчы доказ выдатнай ідэі стварэння такога тэатра.

Яшчэ аб многім можна было б расказаць, з чым мы пазнаёміліся і што ўбачылі ў Чэхаславакіі. Але мы, музыканты, у сувязі з Днямі чэхаславацкай культуры ў Беларусі хацелі ў першую чаргу падзяліцца з чытачамі сваімі музычнымі ўражаннямі з жыцця братняй нам краіны, сваімі ўспамінамі аб «Пражскай вясне».

МАЙСКАЕ

Іржы ФРЫД

І як я, соня, мог праспаць
не ўрачысты марш прыходу!
Ну што ж, цяпер мне — шкадаваць
ажно да будучага года.

А дагадацца б мог, стары,
як першы гром працяў зацішак,
што ўжо сягоння на зары
яна праклюнецца з пупышак.

У парках парыпа спярша
і патыхала свежай брагай,
а поўня з поўнага каўша
ліла магнезію над Прагай.

І раптам — рушылі пісткі
па голлі ўверх, да самай кроны,
як у рашучы бой палкі
пасля апрыклай абароны.

А я... сніў сны. Эх, галава!
Не чуў ні «ўрра», ні страляніны.
Хіба што бачыла сава,
як брама горад зеляніна.

Заняўся дзень — і скончан бой,
стаяць у поўнай форме клёны.
Вясна! Расчулены табой,
вітаю твой парад зялёны.

І на сябе праходзіць злосць.
Здаецца, зноў той сорак пяты
прынёс нам май і весялосць
у касцы рускага салдата.

* * *

Вілем ЗАВАДА

Апёршыся на гор кражы,
мой край праз многія стагоддзі
глядзіць у даль, за рубяжы,
як волат з дзедаўскіх угоддзяў.

Пад сінню ласкавай нябёс
тут вочы ўсмешкамі іскрацца.
Народ, спазнаўшы шчасны лёс,
заняты ўсюды мірнай працай.

Звяво ніву ён сваю
аховтней, чым якое войска,
за справу верную ў баю
заўсёды б'ецца па-геройску.

Скор на руку, на спрыт — агонь,
ён што ні робіць, то ў ахвоту,
і, нібы фрэза ў абалонь,
ўгрызаецца ў сваю работу.

Пад чарамі яго рукі
руда плыве патокам сталі,
прах ажывае, а пяскі
ператвараюцца ў крышталі.

Міралюбівы з даўніх дзён,
гульні ў салдаты ён не любіць,
але і ў ратным полі ён
не адступаў і не адступіць.

З-за снежных, аблавухіх гор
мой край майстроў, гусітаў дзеці,
глядзяць напружана ў прастор:
ім дораг мір на ўсёй планеце.

Пераклаў чэшскай мовы
Язэп СЕМЯЖОН.

У НАШЫХ СЯБРОУ

СТАЛЁВЫЯ МАЧТЫ РЭСПУБЛІКІ

Зірніце на Ханой з вышыні птушынага палёту. З поўдня, поўначы і захаду ў сталіцу ДРВ ідуць апоры высакавольтных ліній электраперадач.

Вялізныя энергазапасы Паўночнага В'етнама. Нетры краіны захоўваюць мільярды тон каменнага вугалю. Звыш тысячы рэк — ад паўнаводнай імклівай Чырвонай ракі да спакойнай Бен-Хай — магутная крыніца гідраэнергіі.

У спадчыну ад старога В'етнама засталіся некалькі маламагутных электрастанцый, ды і тыя былі разбураны вайною. Цяпер узровень 1939 года — года найбольшай вытворчасці электраэнергіі, да раваюцы — пакінуты далёка ззаду.

Сёлета ў ДРВ уступіць у строй першая чарга электрастанцыі ў Уонг-Бі, што будуецца з дапамогаю Савецкага Саюза. Поўным ходам ідзе будаўніцтва электрастанцый у Тай-Нгуене і Бак-Жыя. З дапамогаю савецкіх энергетыкаў праектуецца ГЭС у Тхак-Ба, магутнасць якой будзе роўная магутнасці ўсіх электрастанцый ДРВ, якія дзейнічаюць цяпер. Усяго ў бліжэйшыя гады ў Дэмакратычнай Рэспубліцы В'етнам будзе пабудавана восем электрастанцый і лініі высакавольтных перадач на адлегласці звыш 500 кіламетраў.

ПАЭЗІЯ ДЛЯ УСІХ

У мэтах папулярызацыі паэзіі сярод шырокіх мас чытачоў, варшаўскі клуб кнігавыдаўцоў арганізаваў «Тыдзень польскай паэзіі», у праграму якога ўваходзяць сустрэчы з паэтамі, выстаўка-продаж кніг.

Першыя паэтычныя вечары паказалі, што ініцыятыва гэтая была надзвычай карысная. На сустрэчу з маладым паэтам Станіславам Грахавякам прыйшло столькі народу, што ў зале не засталося ніводнага вольнага месца. Сустрэча хутка ператварылася ў ажыўленую дыскусію. Найбольш радасным а'яўляецца той факт, што пераважная большасць слухачоў — моладзь.

У клубе кнігавыдаўцоў выступілі вядучыя польскія паэты Станіслаў Пентак, Станіслаў Грахавяк, Мечыслаў Яструн, Юліян Пшыбась, Арнальд Слуцкі, Ян Спевак.

Клуб кнігавыдаўцоў збіраецца і далей рэгулярна праводзіць падобныя сустрэчы.

ПРАПАГАНДЫСТ САВЕЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Звыш 300 назваў твораў мастацкай літаратуры агульным тыражом больш сямі мільёнаў экземпляраў выпусціла выдавецтва «Культур унд Фортшрыт» за 15 гадоў свайго існавання. «Культур унд Фортшрыт» — выдавецтва Таварыства германа-савецкай дружбы ў Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы. У гэтым выдавецтве выйшлі на нямецкай мове «Цэмент» Ф. Гладкова, «Рускі лес» Л. Ляонава, «Далёка ад Масквы» В. Ажаева, Раман Г. Нікалаевай «Бітва ў дарозе» выпушчан выдавецтвам тыражом звыш 200 тысяч экземпляраў.

«Культур унд Фортшрыт» рэгулярна выпускае дакументальныя матэрыялы аб растучых сувязях паміж СССР і ГДР. Выдавецтва выпусціла ў свет багата ілюстраваную кніжку «Космас — Масква — Берлін», якая расказвае пра візіт савецкага касманаўта Германа Цітова ў ГДР. Нядаўна на прылаўках кніжных магазінаў з'явілася новая кніжка «Рускі цуд». У ёй шмат фатаграфій, гістарычных і дакументальных дадзеных аб станаўленні новай краіны камунізма. Аўтары гэтага зборніка — лаўрэаты нацыянальнай прэміі Анель і Андрэ Торндайк.

СТАРЭЙШАЯ БІБЛІЯТЭКА

Сібірскай цэнтральнай бібліятэцы — адной са старэйшых у Расіі — нядаўна споўнілася сто гадоў. Тут ёсць больш 250 000 кніг і 1 600 розных рукапісаў і дакументаў. На паліцах бібліятэкі можна знайсці арыгінальныя рукапісы румынскіх пісьменнікаў-класікаў і пісьмы выдатнага румынскага драматурга Іона Луці Караджале да былога сібірскага бібліятэкара Х. П. Петрэску. У Сібірскай бібліятэцы знаходзяцца першыя выдадзеныя ў Румыніі пераклады на румынскую мову твораў Шэкспіра, Льва Талстога, Гоголя, Мальера, Расіна, Гётэ, Андэрсена, Гальдоні, Шылера, Твена і многіх іншых.

Цяпер у Румыніі больш 24 000 публічных бібліятэк. У сярэднім адна бібліятэка прыпадае на 775 жыхароў. У кніжным фондзе румынскіх бібліятэк 72 мільёны тамоў.

Літаратура і МАСТАЦТВА — Кансультацыя

АДКАЗВАЕМ НА ВАШЫ ПЫТАННІ, РАБОТНІКІ КУЛЬТУРЫ

У кожнага работніка культуры, незалежна ад таго, дзе ён працуе, — у горадзе ці ў вёсцы, узнікае многа розных пытанняў: і прававога парадку і па сваёй непасрэднай рабоце, і па працы і зарплаце, і г. д.

Не заўсёды ён атрымлівае вычарпальныя адказы на свае пытанні. І тады работнік культуры піша ў Міністэрства культуры БССР, у БРК прафсаюза работнікаў культуры, у рэдакцыю газеты «Літаратура і мастацтва». Часам на адно і тое ж пытанне ён атрымлівае адказы нават з некалькіх устаноў.

Рэдакцыя газеты «Літаратура і мастацтва» вырашыла з гэтага нумара сістэматычна змяшчаць на сваіх старонках раздзел «Адказваем на вашы пытанні, работнікі культуры».

Сёння кансультацыю вядзе начальнік планава-фінансавага аддзела Галоўнага ўпраўлення кінафікацыі і кінапракату Міністэрства культуры БССР тав. М. ПАРАМОНАЎ. Ён адказвае работнікам кінасеткі рэспублікі, якіх цікавяць пытанні працы і зарплаты.

ПЫТАННЕ. Як плаціць шафёрам раённых аддзелаў культуры, якія дастаўляюць фільмы на кінаперасоўкі?

АДКАЗ. Шафёрам, якія развозяць фільмы па кінаўстаноўках і адначасова сумяшчаюць абавязкі прыёмшчыка-раздатчыка кінакарцін, належыць даплата ў памеры 20 працэнтаў адпаведнай часткі месячнай стаўкі за адпрацаваны час на лініі.

Падстава: п. 17 «в» «Палажэння аб аплаце працы шафёраў», зацверджанага Пастановай Савета Міністраў СССР № 896 ад 11 жніўня 1960 г. і пісьмо Міністэрства культуры БССР ад 4 верасня 1961 г. за № ПФО 5/1813.

ПЫТАННЕ. Які штат работнікаў прадугледжаны на сельскім кінастацыянары?

АДКАЗ. Тыповыя штаты для сельскіх стацыянарных кінаўстановак зацверджаны ў складзе: кінамеханік — адна адзінка, памочнік кінамеханіка, матарыст, касір і білецёр-прыбіральшчыца па 0,5 адзінкі. Пасада матарыста ўстанаўліваецца толькі пры наяўнасці на кінаўстаноўцы ўласнай электрастанцыі, а пасада памочніка кінамеханіка — пры наяўнасці ў кінаапаратнай другога паста.

Для стацыянараў, якім запланавана пастаноўка звыш двух кінасеансаў за дзень, замест 0,5 адзінкі на пасадах памочніка кінамеханіка і матарыста ўстанаўліваецца поўная штатная адзінка.

Падстава: Пастанова Савета Міністраў БССР ад 30 чэрвеня 1960 г. № 378.

ПЫТАННЕ. Якія стаўкі заработнай платы ўстаноўлены для работнікаў сельскіх стацыянарных кінаўстановак?

АДКАЗ. Памеры заработнай платы работнікам стацыянарных кінаўстановак вызначаны ў залежнасці ад зацверджанай планам колькасці дзён кінапаказу ў месяц. Так, стаўка кінамеханіка другой катэгорыі на стацыянары, якому запланаваны паказ кінафільмаў да 16 дзён у месяц, будзе 42 руб. 50 кап., а для стацыянара, які дэманструе фільмы 24 і больш дзён у месяц, — 62 руб. 50 кап. У такім жа парадку ўстанаўліваюцца стаўкі заработнай платы і астатняму персаналу сельскіх кінастацыянараў. У тых выпадках, калі штатным раскладам па асобных пасадах прадугледжана 0,5 адзінкі, стаўкі зарплаты ўстанаўліваюцца ў памеры палавіны месячнай стаўкі.

Падстава: Пастанова ЦК КПСС і Савета Міністраў СССР ад 19 лютага 1960 года № 230.

ПЫТАННЕ. Якая працягласць адпачынку кінамеханікаў і памочнікаў кінамеханікаў стацыянарных кінаўстановак.

АДКАЗ. Пастанова Дзяржаўнага Камітэта Савета Міністраў СССР па пытаннях працы і заработнай платы і Сакратарыята ВЦСПС ад 24 снежня 1960 года № 1335/28 прадугледжвае старшым кінамеханікам, кінамеханікам і памочнікам кінамеханікаў стацыянарных кінаўстановак (гарадскіх і сельскіх) са студзеня 1961 года дадатковы адпачынак па шкодлівасці ў памеры шасці рабочых дзён і, такім чынам, агульная працягласць адпачынку гэтых работнікаў кінасеткі складае 18 рабочых дзён у год.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.
Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, В. Ул. ІВАШЫН, А. Н. МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), П. Ф. ПРЫХОДЗЬКА, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), М. Г. ТКАЧОЎ, І. З. ШАРАХОЎСКІ, І. Б. ШАЦІЛА, Р. Р. ШЫРМА.

Дырэкцыя, партыйная і прафсаюзная арганізацыі Мінскай кінастудыі навукова-папулярных і хранікально-дакументальных фільмаў выказваюць глыбокае спачуванне рэжысёру студыі Мікеніну О. Н. з выпадку напаткаўшага яго цяжкога гора — смерці маці.

Дырэкцыя, партыйная і прафсаюзная арганізацыі Мінскай кінастудыі навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў выказваюць глыбокае спачуванне супрацоўніку студыі Лашыну П. Я. з выпадку напаткаўшага яго цяжкога гора — смерці маці.

Супрацоўнікі Дзяржаўнага выдавецтва БССР выказваюць глыбокае спачуванне рэдактару Міхальчуку Сяргею Афанасьевічу з прычыны напаткаўшага яго гора — смерці бацькі.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Адрас рэдакцыі: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмная рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-25-25, аддзела літаратуры — 3-22-04, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, выдавецтва — 3-19-52, бухгалтэрыі — 3-11-03

«Літаратура і мастацтва» выходзіць два разы на тыдзень: у аўторак і пятніцу

АТ 10222

Друкарня выдавецтва «Звязда».